

Як у скансэне ☞ 3

# Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714



Міхал Кандрацюк ☞ 8

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 18 (2660) Год LII Беласток, 6 мая 2007 г. Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

# Малітва і мастацтва ў царкоўнай музыцы



фота МІРЫ ЛУКШЫ

**З дырэктарам Міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі „Гайнаўка” Мікалаем БУШКО размаўляе Аляксей МАРОЗ.**

***— З 1982 года пачалі ладзіцца Дні царкоўнай музыкі, якія з часам пераўтварыліся ў міжнародны фестываль. У мінулым годзе адбылося XXV юбілейнае мерапрыемства, у час якога выступілі, між іншым, лаўрэаты папярэдніх фестываляў. Як Вы з перспектывы часу ацэньваеце мастацкі ўзровень прэзентаванай царкоўнай музыкі?***

— Царкоўная музыка гэта малітва і мастацтва. Добра, калі адно з другім ідзе ў пары і пры гэтым на высокім узроўні. Калі мы пачыналі ладзіць Дні царкоўнай музыкі, у Польшчы было пад 200 праваслаўных прыходаў. Аднак аказалася, што ў іх ліку няшмат хораў, якія маглі б выступіць на аглядзе, што ў іх найчасцей спяваюць старэйшыя людзі. Не было тады ніводнага дзіцячага ці маладзёжнага хору і амаль не было свецкіх хораў, якія выконвалі б царкоўную музыку. Спяванне ў царкоўным хоры не было тады прэстыжнай справай, а наадварот — небяспечнай, а некаторыя тадышнія палітычныя дзеячы ставіліся да нашага мерапрыемства варожа, успрымалі яго ў катэгорыі ідэалагічнай барацьбы супраць сацыялізму. На працягу 25 гадоў усё памянялася. Амаладзіліся існуючыя хоры, узнікла многа новых, у гэтым ліку і маладзёжных. У станоўчым сэнсе памянялася падыход да царкоўнай музыкі многіх людзей і я думаю, што немалая заслуга ў гэтым Міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі „Гайнаўка”, які я прыдумаў у васьмідзесятых гадах і ад гэтай пары няспынна вяду.

***— XXVI выпуск Міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі „Гайнаўка 2007”, які будзе адбывацца з 6 па 13 мая ў Падляшскай філармоніі і оперы ў Беластоку, будзе праходзіць пад знакам года вядомага кампазітара Караля Шыманоўскага. Што канкрэтна прадбачваеце ў сувязі з гэтым святкаваннем?***

— Ад многіх гадоў традыцыяй фестывалю і маёй амбіцыяй было прапагандаванне кампазітараў сусветнага маштабу, якія стваралі царкоўную музыку. Сярод іх былі англічанін Джон Тавенер ці эстонец Арво Перт. Многія ведаюць, што ў Польшчы царкоўную музыку ствараюць Рамуальд Твардоўскі ці Кшыштаф Пэндэрэцкі, але менш людзей ведае, што царкоўную музыку пісалі Станіслаў Манюшка ці Міхал Рагоўскі, а амаль ніхто не ведаў, што царкоўную музыку таксама складаў і інспіраваўся ёю адзін з выдатнейшых польскіх кампазітараў Караль Шыманоўскі.

Калі ўся Польшча святкуе год Шыманоўскага, мы рашылі прыпомніць гэта фестывальнай публіцы ў ходзе інаўгурацыйнага канцэрта, калі будзе выконвацца жамчужына царкоўнай музыкі „Всенощное бдение” Сяргея Рахманінава. Частка гэтай урачыстай багаслужбы, а менавіта твор „Ныне отпущаеши”, будзе выконвацца з музыкай Караля Шыманоўскага. Апрача гэтага ў час конкурсных аглядаў гэтую малітву з музыкай Шыманоўскага выканаюць удзельнікі фестывалю з многіх краін.

***— Прадбачваецца, што ў фестывалі выступіць адметны хор армянскай дыяспары з Ірана. Якую музыку будзе ён прэзентаваць?***

— Царкоўная музыка выконваецца ва ўсім свеце. Гэта сам хор з Ірана быў ініцыятарам выступу на нашым фестывалі і мы яго залічылі ў лік выканаўцаў. Будзе ён прэзентаваць нацыянальную армянскую царкоўную музыку. На фестывалі выступіць таксама хор Нацыянальнай акадэміі музыкі з Казахстана. Разам будзе амаль 30 хораў з 12 краін свету. Усе хоры незалежна ад нацыянальнасці і веравызнання прыедуць з царкоўнай музыкай.

***— У гэтым годзе будзе створана новая катэгорыя — свецкіх аматарскіх хораў музычных школ. Адкуль такая задума?***

— Ад пачатку фестывалю ладжаны быў конкурсны агляд. Мы стараемся ствараць як найлепшыя ўмовы для выступаючых хораў і набліжаныя магчымасці для перамогі. У гэтым годзе будзе выступаць многа хораў вышэйшых музычных школ. Нельга іх раўняць з выканаўцамі з іншых вышэйшых навучальных устаноў, напрыклад, політэхнічных інстытутаў, бо ў іх музычная адукацыя. Харыстаў з музычных устаноў не падыходзіць нават называць аматарамі, бо яны прафесіяналы, якія спяваюць на самым высокім мастацкім узроўні.

***— У мінулых гадах на фестывалі прагучала інструментальная музыка. Ці ў пазаконкурснай частцы прадбачваеце паказваць іншую свецкую музыку?***

— У гэтым годзе ў рамках фестывалю прадбачваем толькі харавую царкоўную музыку. Аднак амаль у той самы час, калі будзе праходзіць фестываль, у Белавежы будзем ладзіць другое мерапрыемства — „Дні сакральнай музыкі”, дзе будзе можна паслухаць музыку розных цэркваў і веравызнанняў, якія ад стагоддзяў пражывалі на Падляшшы.

***— Плануеце таксама наладзіць у Беластоку канцэрт „На народную ноту”. Якая беларуская музыка будзе тады выконвацца?***

— На працягу 25 гадоў існавання фестывалю мы заўсёды са спецыяльнай пашанай ставіліся да беларускіх хораў. У час канцэрта „На народную ноту” ў гэтым годзе сярод рознай музыкі будзе гучаць таксама беларуская народная харавая музыка беларускіх кампазітараў. Гэтыя канцэрты мы пачалі ладзіць яшчэ ў Гайнаўскім доме культуры, пасля працягвалі ў гайнаўскім амфітэатры, а ў мінулым і гэтым годзе — у беластоцкіх „Сподках”.

***— У гэтым годзе фестываль будзе праходзіць пад ганаровым патранатам прэзідэнта РП Леха Качынскага, чаго не было ў мінулым годзе. Як удалося ізноў прыдбаць прэзідэнцкае апякунства?***

— На першы патранат прэзідэнта мы працавалі 18 гадоў. Упершыню прэзідэнт Аляксандр Квасneўскі патранатам абняў XIX выпуск нашага фестывалю. Ад XX да XXIV выпуску мы карысталіся яго пастаянным апякунствам. Мы вельмі рады, што пасля мінулагодняга недаразумення ў гэтым годзе ізноў вярнуўся да нас патранат прэзідэнта нашай краіны. Гэта вельмі важнае для нас, арганізатараў фестывалю, і, думаю, для ўсіх аматараў царкоўнай музыкі ў Польшчы і за межамі нашай краіны.

***— Дзякую за размову.***

## *Сэнс жыцця для беларусаў* ☞ 2

*Віктар САЗОНАЎ*

Зразумела, што кіраўнік дзяржавы, як і мінулыя разы, зачытаў сваё пасланне на рускай мове. Хіба што першы і пакуль што адзіны прэзідэнт Рэспублікі Беларусь лічыць, што беларускаму народу па-руску будзе больш зразумела. Прыыклі ўжо, за трыста год, чуць ад начальнікаў менавіта такую мову. Можа таму ў раздзеле пра развіццё нацыянальнай культуры і мастацтва гаварылася выключна пра адукацыю, стварэнне рэгіянальных універсітэтаў, пра дапамогу замежнікам падрыхтаваць з іх студэнтаў, што вучацца ў Беларусі, добрых спецыялістаў і ўзяць за гэта немалыя грошы, але ніяк не пра сваю мову...

## *Успаміны, параўнанні* ☞ 2

*Васіль САКОЎСКІ*

Мая маладосць, навука і амаль усё працоўнае жыццё прайшло ў часы так званай народнай улады. Потым жыў я ў Трэцяй, а цяпер жыву ў Чацвёртай Рэчы Паспалітай. Як гэта бывае са старэйшымі людзьмі, часта вяртаюся ў думках да сваёй і нашай нялёгкай мінуўшчыны, прабую аналізаваць яе, параўноўваць. І як не дзіўна, мая ацэнка гэтых нашых трох Польшчаў не зусім супадае з ацэнкай нашых навукоўцаў і, тым больш, сучасных палітыкаў...

## *Мёртвая ціш у Беларусі* ☞ 9

*Раіна СТЭФАНЧУК*

„Ажыццяўленне ідэі дэмакратызацыі і захаванне правоў чалавека ў Беларусі” — пад такім лозунгам вялася дыскусія на юрыдычным факультэце Беластоцкага ўніверсітэта. — У Беларусі не спрацоўвае ні адзін з інструментаў патрэбных для будовы дэмакратыі, — былі згодныя ўдзельнікі універсітэцкай канферэнцыі. Асцерагалі яны, што ў палітыцы ў дачыненні да Беларусі шмат небяспек можа стварыць рэстрыкцыйная рэалізацыя Польшчай Шэнгенскага дагавора...

## *У Чаромсе* ☞ 10

*Уладзімір СІДАРУК*

У мінулым годзе прафесар Галіна Тварановіч перадала больш за трыццаць кніжак, выдадзеных Беларускім літаратурным аб'яднаннем „Белавежа”. Гэта самы каштоўны падарунак, бо такіх кніжак якраз патрабуюць чытачы, у тым ліку студэнты вышэйшых навучальных устаноў. Кніжкі, якія ад імя Праграмнай рады тыднёвіка „Ніва” перадала Ілона Карпюк таксама папоўнілі чаромхаўскі кнігазбор і лічацца каштоўным набыткам, на які прыйшлося б чакаць гадамі...



# Сэнс жыцця для беларусаў

*Дваццаць чацвёртага красавіка 2007 года прэзідэнт Рэспублікі Беларусь звярнуўся з традыцыйным штогадовым пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Пасланне выйшла пад назвай „Независимая Беларусь — наш достойный и надежный дом”.*

*Зразумела, што кіраўнік дзяржавы, як і мінулыя разы, зачытаў сваё пасланне на рускай мове. Хіба што першы і пакуль што адзіны прэзідэнт Рэспублікі Беларусь лічыць, што беларускаму народу па-руску будзе больш зразумела. Прывыклі ўжо, за трыста год, чуць ад начальнікаў менавіта такую мову. Можа таму ў раздзеле пра развіццё нацыянальнай культуры і мастацтва гаварылася выключна пра адукацыю, стварэнне рэгіянальных універсітэтаў, пра дапамогу замежнікам падрыхтаваць з іх студэнтаў, што вучацца ў Беларусі, добрых спецыялістаў і ўзяць за гэта немалыя грошы, але ніяк не пра сваю мову.*

*Трэба адзначыць, што пасланне ў гэтым годзе было дастаткова стрыманым. Не было выказванняў тыпу „калі мы расслабімся, то нас знішчаць і вы ведаеце хто...”, або „там, вы ведаеце хто, толькі і марыць, каб мы памыліліся...”. Наадварот, замест „вы ведаеце хто...” было заяўлена, што мы паступова, але цвёрда і паслядоўна робім міжнародную палітыку Беларусі больш сіметрычнай. Хаця (а без гэтага не магло абысціся) было заяўлена і пра „захаванне прынцыпова важнага для нас расійскага накірунку”, хоць мова паслання і без гэтых слоў падкрэслівала такі накірунак. Можна было і не пытараца. І ў заяве, што галоўнымі нашымі стратэгічнымі партнёрамі ёсць краіны СНД ды яшчэ Кітай таксама ніхто не сумняваўся. Пра гэта, ды яшчэ пра саюз з Расіяй, які нібыта прыносіць рэальную і важкую палітычную, ваенную і эканамічную выгаду абедзвюм краінам гаварылася нашмат больш, чым пра беларускую культуру.*

*Далей прэзідэнт прайшоўся літаральна па ўсіх пытаннях, якія стаяць перад намі жыццё. І пра тое, як нам патрэбнае народаўладдзе, і пра ўсталяванне адносінаў з Еўрасаюзам ды ЗША, і пра адраджэнне вёскі, і пра неабходнасць эканамічных дасягненняў, пошуку новых рынкаў збыту беларускіх тавараў, і пра эфектыўную вытворчасць і ашчаднасць, далейшае развіццё транзітнай інфраструктуры, развіццё камунальнай гаспадаркі і гэтак далей. І нават сказаў як мы гэтага ўсяго даможамся. А менавіта будзем працягваць той курс, якім ішлі. Чаму такі курс яшчэ не змог вырашыць тыя праблемы па ўсіх гэтых пунктах, прэзідэнт чамусьці не канкрэтызаваў.*

*Праўда, пра тое-сёе было заяўлена з вельмі выразнай канкрэтыкай. А менавіта пра тое, што беларусам як паветра патрэбнае будаўніцтва атамнай электрастанцыі. Пра ліквідацыю вынікаў той атамнай электрастанцыі, якая рванула, засыпаўшы Беларусь чарнобыльскай радыяцыяй, гаварыць асабліва не хацелася. Бо як тады звязаць гэта з неабходнасцю новай такой АЭС, тым больш што пасланне агучвалася напярэдадні чарговай гадавіны Чарнобыльскай катастрофы.*

*Дарэчы, на гэты раз і пра апазіцыю асабліва не ўспаміналася, ні пра тое, што яна ладзіць мітынг у памяць чарнобыльскіх ахвяраў, ні пра затрыманні людзей, што расклейваюць абвесткі пра гэтую акцыю, ні пра тое, што лідэры апазіцыі зараз наведваюць забруджаныя рэгіёны, ні пра наступствы тае трагедыі.*

*Толькі беларускае тэлебачанне паказала стужку пра людзей, якія адмовіліся пакінуць забруджаныя тэрыторыі і жывуць у раёнах з павышанай радыяцыяй. Сцвярджалася, што яны сапраўдныя героі і знайшлі свой сэнс жыцця, у адроджанні ад тых, хто ратуючыся ўцёк ад нябачнай бяды.*

*Хіба што сапраўды нам тая атамная электрастанцыя патрэбная. Тады, можа, і ўсе астатнія знойдуць свой „сэнс жыцця”. Хоць будзем спадзявацца, што ад такога „сэнсу жыцця” як чарнобыльская бяда ды руская мова наш народ усё ж здолее адмовіцца. І праблемы нацыянальнай культуры будзе разглядаць не толькі праз прызму адукацыі спецыялістаў.*

**Віктар САЗОНАЎ**



# Успаміны, параўнанні

*Мая маладосць, навука і амаль усё працоўнае жыццё прайшло ў часы так званай народнай улады. Потым жыў я ў Трэцяй, а цяпер жыву ў Чацвёртай Рэчы Паспалітай. Як гэта бывае са старэйшымі людзьмі, часта вяртаюся ў думках да сваёй і нашай нялёгкай мінуўшчыны, прабую аналізаваць яе, параўноўваць. І як не дзіўна, мая ацэнка гэтых нашых трох Польшчаў не зусім супадае з ацэнкай нашых навукоўцаў і, тым больш, сучасных палітыкаў. Паводле іх ацэнкі Народная Польшча гэта проста нейкае непаразуменне, патальнае фэ. І найлепей забыць пра яе і больш не ўспамінаць, каб не скампраметавацца. Успаміны пра яе, тым больш нейкія цікавыя, добрыя прыклады з таго часу, многімі сучаснымі палітыкамі і дзеячамі ўспрымаюцца як „pierdnięcie” ў знакамітай кампаніі.*

*А мяне, напрыклад, крыўдзіць такая ацэнка дзяржавы, якая праіснавала да волі доўга ў такі складаны час і ўсё ж такі дала ўсім нам магчымасці вучыцца, здабываць розныя прафесіі, адысці з перанаселеных вёсак і працаваць згодна з набытымі прафесіямі. А многім адначасна працаваць і вучыцца.*

*Было, канешне, многа і несправядлівасці, непатрэбнай шуміхі, паказухі і нават дурноты ў той час. Але скажыце дзе яе не бывае?! Значыць, за ўсе адмоўныя справы трэба яе крытыкаваць, а за добрыя часам і пахваліць.*

*Якую Польшчу атрымала народная ўлада? Разрушаную, пакалечаную, занядбаную, бедную, малапісьменную. Яшчэ ў горшым стане была Польшча „б”. Бо была і такая.*

*Вось з зусім гэтым і трэба было, як кажуць, змерыцца, паборкацца. І боркаліся. Канешне, не ўсе аднолькава боркаліся і не ўсе адэкватныя карысці з боркання мелі. Былі такія, што толькі шкодзілі — і цяпер у героях ходзяць, чаго пахваліць ніяк не можна. Былі і такія, якія паступалі згодна дэвізу „czy się stoi, czy się leży...”, чаго таксама пахваліць не можна. Але, мне здаецца, што абсалютная большасць усё ж такі салідна, ахвярна адносілася тады да навукі і працы.*

*Вось таму было тады нямала зроблена і добрага, карыснага нашаму грамадству. Ім шчодра карысталася і Трэцяя, і карыстаецца Чацвёртая Рэч Паспалітая. Штосьці астанецца, думаю, і для Пятай. І аб гэтым таксама гаварыць трэба. На жаль, нашы верхаводы нажытым нашым народным багаццем карысталіся і распараджаліся (і надалей тое робяць) неразумна, негаспадарна, а часцяком і зусім крымінальна. А невук ці злодзей, камуністычны ён ці ўжо капіталістычны, з'яўляецца тым самым злодзеем...*

*Давалася ж гэтае нажытае дабро нялёгка. Пры невялічкіх зарплатах і цяжкіх умовах жыцця і працы працавалі мы многа і цяжка. А колькі ж уложана было, коштам свайго здароўя і вольнага часу, зусім бясплатнай грамадскай працы. Садзілі мы лес — і пасадзілі яго многа, многа. На месцы старых развалін і руін стварылі прыгожы парк. Пабудавалі будынкі музея. Праклалі прыгожыя дарогі, бо на нашай Гайнаўшчыне была толькі адна праўдзівая дарога, збудаваная яшчэ царом. Цяпер на гэтыя дарогі страх глядзець — адны дзіры ды калдобіны, бо чамусьці не рамантуюць іх. І гэтак далей.*

*Дасюль многія не могуць забыць пра Геркаўскія даўгі, хаця ўжо даўно няма самога Герка... І ціха-ша пра ўжо новыя нашы даўгі, якія ў чатыры разы перакрочылі Геркаўскія...*

*Чаму так? Чаму так мала ў нас разумных, прынцыповых палітыкаў і журналістаў, якія б праўду-матку рэзалі ў вочы ўсім, незалежна ад іх грамадскай пазіцыі, бязлітасна крытыкавалі зло і славілі дабро. Адным словам, каб усё называлі сваімі праўдзівымі імёнамі.*

*А то часцей за ўсё бывае так, як у бытавым сюжэце яшчэ з царскіх часоў:*

*Малады афіцэр рыхтуецца на баль і проста не адыходзіць ад люстра. Найвыразней відаць, што ён вельмі задаволены сваім выглядам. Каб яшчэ пацвердзіць гэта, ён звяртаецца да свайго дзеншчыка:*

*— Скажи мне, Иван, на кого я похож?*

*— На лэва, вашэ благородые.*

*— А где же ты видел льва?*

*— У нашой цэркі е така ікона, на якій Хрыстос у Суралым на ім ідэ.*

*— Так это же осёл! — рассмяялася благароддзе.*

*— Так точно! Але я не посміў сказаты...*

*Дык вось, пакуль са страху ці ў карыслівых мэтах асла будзем называць „лэвам”, а льва аслом — парадачку не будзе...*

**Васіль САКОЎСКІ**

**Вачыма еўрапейца**

# Барыс Ельцын не жыве



*— Думаю, што свет не ацаніў яшчэ належным чынам ягоную ролю ў роспуску Савецкага Саюза. Мяркую, што ён нават сам не ўсведамляў сабе гэтага, якой быў постаццю ў гісторыі Еўропы. Якраз Польшча і Еўропа абавязаны яму свой сённяшні кшталт, — як аб Барысе Мікалаевічы Ельцыным сказаў першы прэзідэнт дэмакратычнай Польшчы Лех Валэнса. Прэзідэнт Ельцын памёр 23 красавіка пасля цяжкай і працяглай хваробы. Цяжка не пагадзіцца з Лехам Валэнсам і не ацаніць ролю, якую гэты — як яго называлі — апошні цар Расіі адыграў не толькі ў фармаванні Еўропы, але і ўсяго свету, застаючыся ўвесь час у дыялогу, не заўжды галантным, з кіраўнікамі самых вялікіх імперый, галоўным чынам са ЗША.*

*Здаецца, з кожным годам штораз больш прападае нам з памяці тое, што якраз дзякуючы Ельцыну 8 снежня 1991 г. магло дайсці (у год выбару яго на першы тэрмін прэзідэнцтва) да падпісання з тагачаснымі прэзідэнтамі Украіны і Беларусі пагаднення ў Белавежскай пушчы, якое вырашыла аб распадзе СССР і ўзнікненні Саюза Незалежных Дзяржаў. У выпадку беларусаў, дзякуючы якраз м.інш. гэтым ягоным дзеянням, удалося, хоць на кароткі час, цешыцца ім незалежнасцю. Тады пачаліся таксама дэмакратычныя перамены, паспяхова затармажаныя пасля рэжымам Аляксандра Лукашэнкі.*

*Першы дэмакратычны спікер беларускага парламента Станіслаў Шушкевіч некалькі гадзін пасля смерці Барыса Ельцына ўспомніў:*

*— Тое, што Беларусь без праліцця хоць бы адной кроплі крыві стала незалежнай краінай, гэта ў вялікай меры таксама і яго заслуга. Ды калі наша ўлада стала дыктатарскай, гэтага ён не прыкмеціў. Мабыць, яму гэта не падабалася, ды гэта было выгаднае Расіі. А Барыс Ельцын заўжды быў прагматыкам.*

*У сваю чаргу першы прэзідэнт незалежнай Украіны Леанід Краўчук упэўнены ў тым, што „калі б Ельцын не згадзіўся падпісаць у Белавежскай пушчы пагадненне аб дэнансацыі СССР, не было б незалежнай Украіны”.*

*Дзякуючы палітычным кампрамісам постгарбачоўскай палітыкі Ельцына на незалежнасць і абсалютную суверэннасць здабыліся краіны Прыбалтыкі, сярод іх Літва. Тагачасны прэзідэнт гэтай краіны Вітаўтас Ландсбергіс сёння сцвярджае:*

*— Адышоў чалавек, які адыграў вялікую ролю ў нейкі кароткі, ды бурлівы перыяд. Перыяд, які адмяніў выгляд свету. Быў ён чалавекам гонару, які стрымліваў дадзенае слова.*

*Таму стрымаў ён слова, калі абяцаў прэзідэнту Валэнсу, што з Польшчы будуць выведзены савецкія войскі. Пасля ўшанаваў ахвяры Катыні і перадаў дакументацыю звязаную з гэтай трагедыяй. Стрымаў ён слова м.інш. тады, калі год раней пакрытыкаваў Міхаіла Гарбачова і КПСС, а пасля выдаў указ аб роспуску камуністычнай партыі, а затым аб нацыяналізацыі яе маёмасці. Нікому іншаму якраз як яму ўдалося здушыць дзяржаўны пераварот незадаволеных генералаў, названы ад прозвішча іх завадатара путчам Янаева. У сваіх мемуарах пісаў: „Ад пачуцця таго, да чаго мы прывыклі, нарадзілася новае пакаленне палітыкаў”. У адным з інтэрв'ю сказаў: „Мы былі наіўнымі і сустрэла нас расчараванне”. І далей: „У апагей дэмакратычнай эйфарыі панавала ўражанне, якое і мне перадалося, што захутка збіраем плён перамен, змены палітычнай сістэмы. Маю на думцы папраўку жыцця грамадзян. Гэта была памылка”.*

*Быў таксама Барыс Ельцын, далікатна сказаўшы, супярэчлівай постаццю і не кажу тут аб справах фальклорна-маральнай натуры. Ніхто іншы як не ён адказны за інвазію на збунтаваную Чачню. Палітык, дзяржаўны дзеяч, які, аднак, не бярэцца за перамены, улічыўшы рызыку, памылак не робіць.*

*Барысу Ельцыну споўнілася 76 гадоў.*

**Мацей ХАЛАДОЎСКІ**

# ЯК У СКАНСЭНЕ


Свіслачаны


Лясная ніва дзікоў


Pralka, lodówka, telewizor

**Па жвіроўцы, што між Зубкамі і Ялоўкай, машыны публічнай камунікацыі не курсіруюць і трэба ў тых баках вандраваць на чым пападзе. Пакуль што няма там яшчэ нейкіх тыповых прыманак, што прыцягвалі б масавага наведвальніка. Наступ прыроды, здаецца, прытармозіў крыху Еўрасаюз, але пакуль цяжка гадаць як складзецца лінія фронту паміж ёй і чалавекам. Бо зараз за Зубкамі, за чыгункай, папружынаванае ў мінулым годзе поле бярэ ў сваё ўладанне пырнік. Крыху далей някранутая пожня, яшчэ далей — узараная цаліна.**

У маладым лесе, налева ад дарогі ў Свіслачаны, заўважаю нешта белае. Заглядаю, акружаючы азіміну. А там, у лясочку, ляжыць тройца бытавога культу геркаўскай эпохі — pralka, lodówka, telewizor. Гэтакі трыадзіны дэсант паказвае, што нехта новы расчысціў старую хату з нямоднай ужо бытавіны, пасля таго, як немінучы час забраў з яе аджытых уласнікаў. І той новы чалавек жа інтуітыўна ведае, што найлепшым утылізатарам усялякіх рукатворных выдумак астаецца спрадвечная прырода, якая прымае ўсе дары не патрабуючы ніякіх справак ці квітанцый. І найвыгадней закінуць непатрэбшчыну ў лес, каб занадта нікога не калола ў вочы.

Пад Мастаўлянамі чалавек абрабляе зямельку конікам. На палетку будзе крышку збожжа, мяшанкі аўса з ячменем — на корм і для коніка, і для свінча; свінінка спатрэбіцца гарадскім дзецям і ўнукам земляроба. За Мастаўлянамі таксама відаць некалькі коней, якія яшчэ цягаюць пастронкі заміж вазіць вярхом новых, гарадскіх ужо, паноў.

Кіруюся ў Дубляны, вёску, якая наглядальніку ад жвіроўкі паказвае толькі пару будынкаў. Сёлета, навесну, першы з іх згарэў… Вясковая вуліца, што перпендыкулярна адыходзіць ад шашы, вузенькая, брукаваная. А абапал вуліцы від сумны, быццам пасля нейкай дэмаграфічнай катастрофы, быццам сюды сягала чарнобыльская зона. Нямногія пакінутыя будынкі запушчаныя да стану развалін.

Толькі ў самім канцы вёскі, ад ракі Свіслачы, ад граніцы, спатыкаю жанчыну, што паказалася на вуліцу. І гутарка атрымоўваецца сумная, так як сумная вёска Дубляны. Пастаянна пражывае тут толькі восем душ, пажылых людзей. Не даходзіць сюды ніякая публічная камунікацыя. У недалёкія мастаўлянскія калоніі заглядае па аўторках школьны аўтобус з Гарадка; у Дубляны ён не заязджае, бо Дубляны ўжо ў Міхалоўскай гміне. Каб хаця хто падумаў, каб гмінныя ўлады ў Міхалове пахадайнічалі пра аўтобусны маршрут з Беластока ў Ялоўку ці з Ялоўкі ў Беласток праз Дубляны і Мастаўляны. Мая субяседніца яшчэ ў сілах дабрацца на той гарадоцкі школьны аўтобус і ў Гарадок за пакупкамі з'ездзіць. Але іншыя жыхары забытай уладамі вёскі ўжо і гэтым пакарыстацца не могуць. У трох хатах ёсць тэлефон, па якім можна выклікаць дапамогу…

Згаданая хата ў пачатку вёскі загарэлася ад падпалу. На маю здагадку, што мо нехта з шашы недакурак кінуў, жанчына адказала, што агонь загарэўся з сярэдзіны. І быў гэта ўжо трэці пажар у Дублянах за апошнія пяць гадоў; нехта падпальвае тут апусцелыя хаты.

Іду ў хату насупраць панадворка маёй субяседніцы. На ёй салтысоўская шыльда, але солтыса даўно ўжо ў Дублянах няма — так згарнулася вёска. У хаце мае быць двое жыхароў, але гутарыць са мной толькі гаспадыня; размаўляем на кухні. Мяркую, што гаспадар цяжка хворы і знаходзіцца ў пасцельным рэжыме, у спальні. А гаспадыня расказвае пра гаротную долю Дублян…

Калісь у Дублянах 84 нумары было; здаралася па двух-трох гаспадароў на адным панадворку. У вайну адступаючыя немцы арганізавалі рубеж абароны на рацэ Свіслачы. Дзеля гэтага спалілі вёскі, якія маглі б прыкрываць праціўніка: з заходняга боку ракі Дубляны і з усходняга Бурстаўшчыну. Калі на будынку не было саламянай страхі, дык палівалі збудаванне бензінам. Згарэла ўсё, нават платы не асталіся…

Калі фронт адышоў, у Дубляны адразу прыехалі агітатары, каб людзі тут не будаваліся, толькі да саветаў ехалі, абяцалі там жыллё. І людзі паехалі, больш за палову вясковцаў. З тых, што выехалі ў Савецкі Саюз, ніхто ніколі ўжо на радзіму не прыязджаў, нехта толькі пісьмо прыслаў… Бурстаўшчыну таксама не адбудоўвалі, толькі перасялілі яе жыхароў у іншыя вёскі. Тыя, што асталіся ў Дублянах, адбудоўваліся, але іхнія дзеці павыязджалі ў Беласток. Зараз астаецца тут трох мужчын і пяць жанчын, усе старыя.

Калісь дублянскія дзеці вучыліся ў Мастаўлянах. У Дублянах была крама. Цяпер Дубляны наведвае аўтакрама па аўторках і пятніцах. Аўтобуса няма. Няма ні каня, ні каровы. Няма ніякае павозкі. Нават каб паехаць да лекара няма каго наняць. Калісь, яшчэ пры камуне, меў хадзіць аўтобус з Ялоўкі праз Баброўнікі ў Беласток. Але няма. Колькі прашэнняў ні пісалі жыхары Дублян… І меў ужо быць, але яго далі Залешанам. Каб хаця да Калоніі Мастаўляны даходзіў…

Зараз за Дублянамі, каля рэчкі, крыніца ёсць. Пры камуне мелі да яе дарогу пракласці, ваду тую набіраць і з яе ліманад рабіць. Але няма ўжо камуны, і дарогі таксама не праклалі. Брук у вёсцы паклалі, бадай, пры санацыі. А крыж, што за шашою стаіць, паставілі яшчэ ў незапамятны царскі час; крыж нядаўна аднавілі.

За Дублянамі, на зарослых ужо лесам схілах, што сходзяць да ракі, астаўся яшчэ след вайны, франтавыя траншэі, з якіх немцы мелі весці агонь па рубяжы Свіслачы. Дзеля лепшай бачнасці спляжылі яны надрэчныя вёскі; іх не было каму бараніць. Траншэі зарастаюць лесам, але і сёння гісторыя Дублян павярнула кругам. Зноў іх нехта паліць, зноў некаму за іх заступіцца…

З канца вёскі, што ад Свіслачы, не хацелася мне вяртацца на нудную шашу, а мае суразмоўцы сказалі, што з іхняга канца Дублян ёсць дарога ў Ялоўку, каля кіламетра карацейшая за шашэйную. Падаўся я ёю…

Дарога павяла мяне праз прыгожы яловы лес, які, здаецца, вырас пасля вайны, быццам на пакінутых палях тых дублянцаў, якія падаліся ў запаветны савецкі Ханаан. І тая дарога завяла мяне туды ж: перада мною вырас польскі гранічны слуп у забагненай даліне Свіслачы.

Асадзіў я назад і павярнуў у іншую лясную дарогу — мабыць яна ў Ялоўку давядзе. Але завяла яна мяне ў лясны тупік і растварылася ва ўзаранай дзікамі яліне. Тут можна было дзіву давацца, якімі руплівымі землярobамі з'яўляюцца дзікі — яны паднялі там кожную пядзюляснай паверхні! Мо яны дачуліся пра еўрасаюзныя даплаты да землярobства?..

Вярнуўся я яшчэ раз і знайшоў трэцюю дарогу, з калдобінамі. А калі з калдобінамі, падумалася мне, дык павінна гэта быць мужыцкая дарога, верагодна тая, пра якую мне гаварылі ў Дублянах. І па ёй я зайшоў да расхадных дарог, што перад Кандраткамі. Адсюль падаўся не ў напрамку газанапорнай станцыі, але ў бок колішняга пэгеэру.

І той колішні пэгеэр выглядае як пасля дэмаграфічнага бедства, быццам быў у чарнобыльскай зоне. З аднаго боку шашы населеныя ветрам два адміністрацыйныя будынкі, абора, майстэрня, электраслупы без трансфарматара і правадоў, зарастаючыя травой асфальты… З левага боку шашы нешта накшталт экалагічнай катастрофы — колішні рыбны стаў без вады нагадвае і возера Чад, і Аральскае мора: пасярэдзіне шэрага балота струіцца голы ручаёк. Сама вёска Кандраткі выглядае крыху быццам лепш…

Калі б нашымі вось такімі выдатнасцямі, гэтым своеасаблівым скансэнам, зацікавіўся масавы наведвальнік з шырокага свету, цікава, як да гэтага паставіліся б нашы чыны: мо спрыялі б разбудове тут турыстычнай інфраструктуры?.. Бо, калі прыгадаць догмы нядаўніх нашых класікаў, пра ўсё вырашаюць масы. А іх на Усходняй сцяне акурат няма.

**Тэкст і фота**
**Аляксандра ВЯРБІЦКАГА**

## Гайнаўка перад фестывалем

13 мая г.г. у Свята-Троіцкім саборы распачнуцца „Гайнаўскія дні царкоўнай музыкі”. Яны будуць працягвацца да 18 мая. Заспяваюць 32 хоры, між іншым, з Беларусі, Расіі, Літвы, Латвіі, Балгарыі, Грэцыі, Украіны і Галандыі.

Выступіць хор Варшаўскага політэхнічнага інстытута, хор Гданьскага політэхнічнага інстытута, „Кантылена” з Вроцлава, хор з Гомеля на Беларусі, „Залатыя вароты” з Кіева (Украіна). Сёлета заспявае звыш 1 000 харыстаў.

Гайнаўскі фестываль традыцыйна адкрые Дзяржаўны хор з Мінска (Беларусь) — мінулагодні пераможца конкурсу.

Выступяць хоры амаль з усёй Польшчы, у тым ліку Вроцлаўска-Шчэцінскай, Холмска-Люблінскай епархій, хоры духавенства Беластоцка-Гданьскай епархіі. Прыедзе таксама хор Гродзенска-Ваўкавыскай епархіі.

18 мая адбудзецца сустрэча з царкоўнай музыкай у пленэры каля Асяродка лясной адукацыі „Ягелонскае” каля Белавежы пад лозунгам „Славяне ў Белавежскай пушчы”. Распачнецца яна познім вечарам пад адкрытым небам.

Белавежа

## Сумныя, знявечаныя дрэвы

Куксы ліпаў і іншых дрэў не ўпрыгожваюць адну з галоўных вуліц у Белавежы (Гайнаўскі павет) — вуліцу Генерала А. Вашкевіча. Між іншым, на ёй адсеклі верхавіны і бакавыя галіны для двухсот дрэў! І дзе гэта — у Белавежы! А колькі ж такіх дрэвападобных раслін знаходзіцца зараз на іншых белавежскіх вуліцах. Знявечаныя дрывасекамі ліпы не пажывуць доўга, яны хварэюць. Гэта слупы і з іх не заўсёды адрастаюць галінкі. Яны — помнікі людской дурноты. Хто на такое дае дазвол? Хто гэта ўчыніў у найбольшай вёсцы Белавежскай пушчы?

## Несумленнасць

У допісе п.з. „Абочыны ў хмызняку” („Ніва” № 50 ад 10.12.2006 г.) я пісаў пра кустоўе ля павятовай асфальтавай дарогі са Старога Ляўкова ў Сушчу. Дарога гэтая на тэрыторыі Нараўчанскай гміны (Гайнаўскі павет). На ёй кусты „выйшлі” з равоў да самой маставой. Дарога вузкая і з-за таго, і з-за хмызняку небяспечная. Калі аўтобусы або грузавыя аўтамашыны мінаюцца і з’язджаюць на абочыны, тады галіны б’юць у шыбы. У гушчары цяжка разгледзець дарожны знак.

Радны з Новага Ляўкова выносіў прапанову падчас сесіі Рады гміны ў Нараўцы, каб Павятовае праўленне дарог высекла кусты пры тракце дзеля добрай бачнасці і тым самым бяспекі.

Атрымаў ён адказ кіраўніка ППД у Гайнаўцы Тадэвуша Станкевіча, што прыдарожны хмызняк высекуць да 30 сакавіка 2007 года. Кіраўнік ППД не стрымаў слова. Маем пачатак мая, а абочыны надалей у хмызняку. **(мох)**

# Культура ў гміне

**Гутарка з Аннай СТУЛЬГІС, дырэктарам Гміннага асяродка культуры ў Нараўцы.**

***— Нядаўна ў Нараўцы была адкрыта нетыповая ў вясковым антуражы мастацкая галерэя імя Тамары Саланевіч. Ці ўжо можна меркаваць пра яе ролю?***

— Галерэя не падлягае Гміннаму асяродку культуры, яе курыруе Управа гміны ў Нараўцы. Мы яе рыхтавалі. Да гэтай пары наведвалі яе асобныя адзінкі, бо яшчэ не атрымала яна шырокай вядомасці. Звесткі пра яе запушчаны ў Інтэрнэт і яе папулярнасць павінна расці. Галерэю можна наведваць з серады да нядзелі. Прэзентуюцца ў ёй карціны з некалькіх пленэраў, што адбываліся на тэрыторыі Нараўчанскай гміны: і ў Нараўцы, і ў Ляўкове, і над Семяноўскім вадасховішчам. Сёлета такі пленэр адбудзецца ў Зялёнай школе ў Семяноўцы.


фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

***— Мне здавалася, што гэтыя пленэры меў штогадова прымаць будынак былой школы ў Старым Ляўкове...***

— Не, ён пустуе і для яго гміна шукае пакупніка.

***— Якую дзейнасць падтрымлівае Ваш Асяродак?***

— На тэрыторыі гміны дзейнічаюць два фальклорныя калектывы: „Нараўчанкі” і „Цаглінкі”. У гэтым годзе адзначаем юбілей „Нараўчанак”, меў ён адбыцца вясной, аднак па прычыне сямейных абумоўленасцей аднной з харыстак мерапрыемства адтэрмінаванае на восень. Пры Гмінным асяродку культуры працуе таксама маладзёжны калектыў „Obraz Kontrolny”, які складаюць тры асобы з Гайнаўкі і адна з Альхоўкі. Выконвае ён мясцовую беларускую музыку, забяспечвае ёю нашы мерапрыемствы. Маем яшчэ дзіцячы калектыў „Душкі з пушкі”, але яго дзейнасць нам згортваецца. Справа ў тым, што дзеці могуць у нас займацца толькі ў пасляшкольны час, а бацькі не заўсёды ў змозе прывезці іх тады. Ёсць надзея, што такі калектыў узнікне ў школе, дзе на працу стала новая настаўніца музычнага выхавання.

***— Як у Вас ладзіцца праца з пасобнымі ўзроставымі групамі?***

— Наша ўстанова вельмі шчыльна супрацоўнічае з мясцовым колам пенсіянераў. У Нараўцы душою гэтай арганізацыі з’яўляецца спадарыня Ядвіга Карпюк, якая ўмела прыцягвае да супрацоўніцтва дзяцей! Дзеці давалі пастаноўкі на Дзень бабкі і дзедкі, Дзень жанчын. У час канікул наша пані Ядзя ладзіла дзецям чытанне казак. З людзьмі сталага ўзросту супрацоўніцтва не атрымалася. Я прабавала ладзіць ім запусты, але беспаспяхова. Яны аддаюць рашучую перавагу дамашнім справам. Можа яны заняты работай, можа выхаваннем дзяцей... Затое пенсіянеры задзіўляюць мяне сваёй энергіяй. Гуляюць на нашых мерапрыемствах; аж здзіў бярэ, адкуль у іх бярэцца столькі сілы! З дзяцей займаецца ў нас вельмі актыўная група. Мастацкія заняткі вядзе з імі Кася Бяляўская. Ладзіць яна маскарады, катанні на санках, заняткі па рукадзеллю. Напрыклад, пляценні макрамэ нашых дзетак, выкананыя са шнурка для снапавязалак, былі ўзнагароджаны ў Шчэціне.

***— Гмінны асяродак культуры ахоплівае таксама і святліцы...***

— На тэрыторыі гміны маем трынаццаць святліц разам з вясковымі клубамі. Яны адрамантаваны, аснашчаны. Наш войт, Мікалай Павільч, дбае пра гэтыя ўстановы. Варта вылучыць некаторыя з іх. У Альхоўцы мастак Тадэвуш Кшыжанскі, які ў пушчанскую вёску перасяліўся з Кракава, разбуджае ў дзяцей мастацкі зацікаўленні. Ён вядзе свае заняткі на грамадскіх пачатках, а прыязджаюць да яго дзеці нават з Лесной. Вельмі энергічна дзейнічае святліца ў Старым Ляўкове: ладзяць там запусты ці заняткі па аэробіцы. Там добрыя ўмовы, якія дазваляюць даваць прапановы так для душы, як і цела.

***— Як маюцца ў Вас бібліятэчныя справы?***

— Наша Гмінная бібліятэка мае дзве філіі — у Семяноўцы і Старым Ляўкове; апошняя вядзе бібліятэчны пункт у Лешуках. Кнігамі карыстаюцца галоўным чынам студэнты і вучні. Бібліятэка ў Нараўцы вядзе інтэрнэтную „Іконку”, і мы тут наглядаем, каб дзеці карысталіся сецівам для адукацыйных мэтаў, каб не запускалі гульняў. Дарэчы, у апошні час рэзка падае чытальніцтва сярод дзяцей і моладзі. Дарослыя чытаюць больш-менш на пастаянным узроўні.

***— Як складваюцца Вашы адносіны з іншымі ўстановамі?***

— У нашым асяродку базіруецца Згуртаванне прыяцеляў Нараўчанскай зямлі. Яно налічвае каля шасцідзесяці членаў, у тым ліку шмат выхадцаў з нашай гміны, аднак пастаянна дзейнічае ў прынцыпе толькі актыў. Старшынствуе яму Оля Зданоўская-Місяюк, ураджэнка беластачанка. Вось цяпер прымаем працы на аб’яўлены намі штогадовы конкурс „Нараўчанская зямля — учора, сёння, заўтра”, які завяршыцца ў палове мая. На падвядзенне вынікаў запрашаем мастацкі калектыў, здабываем у спонсараў узнагароды. Згуртаванне ладзіла ёлку для бяднейшых дзяцей, на якую ўдалося, дзякуючы спонсарам, прыдбаць дзецям падарункі; раздаваў іх Дзед Мароз, у якога ўвасобіўся спадар Кшыжанскі. З Белавежскім нацыянальным паркам ладзім у час зімовых канікул катанне на санках. Гэтаксама з Надлясніцтвам Броўск, якое знаёміць нашых дзяцей са сваім Залам прыроднай адукацыі. Гмінная ўправа забяспечвае нашым калектывам і дзецям транспарт на мерапрыемствы. З Ляўкоўскім керамічным заводам ладзім фэст у Дзень будаўніка. Кааператы́ўны банк з’яўляецца спонсарам рэгаты кабінных яхтаў.

***— Калісь у месцы, дзе цяпер стаіць будынак Гміннага асяродка культуры, было кіно...***

— Кіно ў нас нерэнтабельнае. Раней мы завозілі фільмы для патрэб школы, аднак школа атрымала сучасную аўдыёвізуальную апаратуру ад Польскага тэлебачання і сама забяспечвае свае фільмавыя патрэбы. Нашу кіназалу скарыстоўваем для ўласных мэтаў.

***— Не ведаю, ці я пра ўсё цікавае Вас распытаў. Можа маеце што дадаць да сказанага?***

— Мы наладзілі пастаянны кантакт з Домам культуры ў Пружанах. Вось яны выбіраюцца да нас на Ноч Купалы з калектывам з 35 асоб. А нашы абодва калектывы — „Нараўчанкі” і „Цаглінкі” — паедуць у верасні з рэвізітам у Пружаны. Гэтыя візіты служаць вельмі плённаму абмену самадзейным вопытам. Варта паведаміць, што ў Пружанскім раёне ёсць каля сямідзесяці святліц са сцэнай і аснашчанай аўдыторыяй. З чэрвеня прымем удзел у варшаўскай прэзентацыі падляшскіх вясковых гмін. Заспяваем там нашы беларускія песні, бо ж менавіта яны складаюць рэпертуар нашых самадзейнікаў, запрэзентуем нашу традыцыйную кулінарыю. У верасні мінулага года прэзентаваліся мы ў Вільні. „Нараўчанкі” аднаўляюцца, цяпер у калектыве займаецца каля дваццаці асоб. 19 мая ў нашым Асяродку адбудуцца Ваяводскія прэзентацыі дзяцей і моладзі пачатковых і гімназічных школ. 26 мая народны фэст у Нараўцы разам са святам Гранічнай стражы. 1 чэрвеня дасць канцэрт духавы аркестр. 14 ліпеня Купалле...

***— Дзякую за размову.***

* * *

У ліку іншых мерапрыемстваў, запланаваных сёлета Гмінным асяродкам культуры ў Нараўцы, варта яшчэ назваць народны фэст у Семяноўцы (9 жніўня), такі ж фэст спалучаны з Днём будаўніка ў Старым Ляўкове ў жніўні, пасляпленэрная мастацкая выстава ў Галерэі (жнівень-верасень), Дзень сеніёра ў кастрычніку, конкурс „Гвязда і калядка”...

**Аляксандр ВЯРБІЦКІ**

# Жыровічы — частачкі неба на зямлі!

*... калі абяскрыльвае*
*бедстваў цяжар*
*і скрусе гатовы скарыцца —*
*ідзі і вазьмі*
*сапраўды Божы Дар*
*Жыровіцкай цуда-Крыніцы...*

**(З багаслоўска-літаратурнага лістка „Жыровіцкая Абіцель”)**

* * *

— А ці жадаеце схадзіць да святой крыніцы? — спытала мяне сястра Зінаіда.

— Вядома, жадаю.

Ужо раней я назірала за духоўнай смагай народа ды не магла адвесці вачэй ад паломнікаў, якія пакетамі набывалі святую ваду ў манастырскай краме (1,3 $ за паўтаралітровы буталь). Цудоўная вадзіца тут на першым месцы, ды мала хто з пакупнікоў абыходзіцца адной бутэлькай. Размах, з якім ёю абяспечваюцца прыезджыя чуць не прамысловы. Асабліва шчыруюць уласнікі аўтамабіляў. Гляджу і не магу надзівіцца. Дзядзькі, на выгляд бізнесмены, курсіруюць сюды-туды з кампактнымі пакетамі да сваіх сярэбраных легкавушак. У галаве ўзнікае падазрэнне — ці не на гандаль выкупляюць яны гэты цудоўны напой?

Аказваецца, што наадварот. У такі спосаб багацейшыя вернікі хочуць падтрымаць сціплы бюджэт манастыра. Бо кожны з паломнікаў можа дарма зачэрпнуць любую колькасць святой вадзіцы. Дзеля гэтага хопіць падацца да крыначкі, якая знаходзіцца паўтара кіламетра ад манастыра...

* * *

У Жыровічах тры святыя крыніцы. Першая знаходзіцца пад алтаром Спаскага сабора. Уваход у падзямелле да калодзежа абмежаваны, дабрацца туды можна толькі пасля спецыяльнага благаслаўлення. Паводле манастырскіх запісаў, крыніца выбіла ў час цудоўнага аб’яўлення Іконы Божай Маці. Цягам стагоддзяў ля яе маліліся пакаленні беларусаў. Доступ да крыніцы быў закрыты пасля апошняй вайны, калі ўлады распусцілі чуткі пра яе атручанасць. Хоць манастыр ніколі не спыніў сваёй службы, атэісты перашкаджалі як толькі ўмелі. Забараняўся ўваход на манастырскі пляц пасля багаслужбы, забаранілі біць у званы, забаранілі выходзіць на прыманастырскі дзядзінец з хрэсным ходам.

Вернікі з болем успрынялі вестку аб закрыцці цудоўнай крыніцы:

— У той самы дзень, паўтара кіламетра ад манастыра, выбіла новая крынічка, — сястра Зінаіда апавядае пра чарговы цуд, які здарыўся ў гэтым чароўным куточку Зямлі.

З часам новая крыніца пераняла ролю гістарычнай. Сёння тут знаходзяцца яшчэ дзве лазні (забудаваная для жанчын і адкрытая для мужчын), у якіх акунаюцца і аздараўляюцца хворыя.

Да трэцяй крыніцы, якая выбіла напрыканцы 1980-х гадоў, прыходзяць паломнікі з хворымі вачыма.

* * *

Люблю думаць пра сястру Зінаіду, бо ад самой думкі душа супакойваецца. Люблю ўспамінаць яе добры, намолены твар і гатоўнасць несці дапамогу ў кожнай, самай найменшай справе. Раніцай, пасля багаслужбы, завяла яна мяне да магілак старцаў. Магілы іераманаха Іераніма (Каваля) і схіархімандрыта Мітрафана (Іліна), якія знаходзяцца за Крыжаўздзвіжанскай царквой, уражваюць сваёй звычайнасцю, сціпласцю. Яны, паводле насельнікаў абіцелі, маленькія вокны ў неба. Тут збываюцца малітвы, прыходзяць адказы на самыя складаныя і балючыя пытанні. Сястра Зінаіда кожны свой дзень пачынае з малітвы ля магіл старцаў.



Брат Міхал сустрэў сваіх землякоў

— Інакш усё выпадае з рук, — прызнаецца былая эканамістка з Мінска.

Да той крынічкі, дзе знаходзяцца лазні, павёў мяне сам паслушнік архімандрыта, брат Міхал. Сястра Зінаіда, з думкай пра маіх родных і хворых сяброў, прыдбала мне пяцілітровы буталь з-пад мінералкі.

У дарозе, якая сцяжынай слалася між лясных узгоркаў, а за плячыма віднеў пасёлак пазначаны куполамі, мы загаварылі аб „праваслаўных” мовах. Брат не мог надзівіцца, што польскія беларусы рэдка вывучаюць рускую мову. А звестка, што моладзь не разумее рускай мовы, проста яго шакіравала:

— Не можа быць, — здзіўляўся паслушнік, — то ж руская і беларуская мовы падобныя як дзве кроплі вады.

— І ў нас кажуць тое самае, што польская і беларуская падобныя як дзве кроплі вады...

Сам брат Міхал захоплены Расіяй і глыбінёй рускага манастырскага жыцця. Зараз ён пабывае ў Пскоўска-Пячэрскай лаўры. У Жыровічы прыехаў на некалькі дзён наведаць дарагіх братоў і айцоў, бо тут і пачаўся яго духоўны шлях.

— Падабаецца Вам манаскае жыццё? — пытаю падобнага на анёла паслушніка:

— Я задаволены жыццём, — усміхаецца. Апавядае пра сваіх мястэчковых сяброў, якія спіліся або сышлі на дрэнны шлях.

Калі мы завандравалі да святой крынічкі, нас чакаў мілы сюрпрыз. Брат Міхал сустрэў сваіх землякоў ад Салігорска. Разам з імі мы вярнуліся на машыне ў Жыровічы. Такім чынам я крыху супакоілася, бо баялася, што брат Міхал усю дарогу сам будзе несці ўсе нашы пасудзіны са святой вадзіцай. Пры ім я выглядала тры разы здаравейшай — вядома, ідзе тут пра знешні выгляд!

*(працяг будзе)*

**Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК**



Лазня

## Шаноўныя сябры, суайчыннікі, землякі!

Звяртаюцца да Вас майстры Народнага клуба „Рошва” Цэнтра рамёстваў і нацыянальных культур горада Полацка.

Полацкая зямля унікальная і непаўторная часцінка Беларусі, калыска Усяслава Чарадзея і Рагнеды, святой Прападобнай Еўфрасінні Полацкай і першадрукара Францыска Скарыны, вучонага і мысліцеля Сімяона Полацкага і іншых знакамітых людзей краіны, духоўнымі спадкаемцамі якіх мы ўсе з’яўляемся.



У маі 2007 года самы старажытны горад Беларусі адзначае свой 1145-гадовы юбілей. І каб паўней адчуць наша духоўнае яднанне, мы, майстры клуба „Рошва” задумалі зрабіць гораду падарунак — рукатворны абярэг, да стварэння якога запрашаем усіх людзей добрай волі, чыё сэрца адкрыта для дабра і яднання.

Умовы ўдзелу ў праекце:

— у любой тэхніцы ласкутовага шыцця выконваецца пано памерам 45х45 см. у гатовым выглядзе;

— малюнак і сюжэт могуць быць рознымі па жаданню аўтара;

— невалодаючыя тэхнікай ласкутовага шыцця могуць вышыць або выткаць пано (з бавоўняных нітак);

— працу пажадана суправадзіць лістом з указаннем прозвішча, імя, імя па бацьку, месца пражывання і кароткіх звестак аб аўтары;

— гатовае пано неабходна адправіць па адрасе: Клуб „Рошва”, Цэнтр рамёстваў і нацыянальных культур, вул. Леніна, 27, г. Полацк, 211400, Віцебская вобласць, Рэспубліка Беларусь. Міжнародны праект „Полацкі абярэг”, Ярмух Ніна Іосіфаўна (кіраўнік клуба). З гэтых маленькіх пано будзе складзена вялікае палатнообярэг, якое ў дні святкавання юбілею ўпрыгожыць горад, а потым будзе перададзена ў фонды Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка горада Полацка. Усе ўдзельнікі праекта атрымаюць фотаздымкі абярэга, а таксама яго выяву можна будзе ўбачыць у Інтэрнэце на сайце http://talkmaker.narod.ru/. Калі адрас памяняецца, аб гэтым будзе паведамлена дадаткова.

Працы дасылаць просім не пазней 20 мая 2007 года.

**Кантактныя тэлефоны:**
**Ярмух Ніна Іосіфаўна, кіраўнік клуба**
**Раб. тэл. + 3752144 28 257**
**Маб. тэл.+375 295 121278**
**E-mail: maximya@mail.ru**

Спадзяемся на вашу добрую волю і непасрэдны ўдзел у праекце.

зорка
для дзяцей і моладзі



Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

# Лаўрэаты „Роднага слова — 2007”!



*Аляксандра Сарокін (Бельск-Падляшскі)*



*Дарак Бародзіч (Бабікі)*



*Элені Пападапаўлёў (Гарадок)*



*Філіп Хомік (Беласток)*

Камісія ў саставе: **д-р Васіль Сегень** (старшыня), **Іаланта Грыгарук, Альжбета Фіёнік** назначылі пераможцаў у чатырох катэгорыях. Ніжэй друкем іх прозвішчы і школы.

**У катэгорыі: дашкольнікі:**

**Гран-пры: Міхась Бабік** — Прадшколле н-р 14 у Беластоку.

**Спецыяльная ўзнагарода** наймалодшаму ўдзельніку — **Лукаш Заброцкі** — Прадшколле н-р 14 у Беластоку.

**І месца:** Якуб Койла — Прадшколле н-р 14 у Беластоку,

Адрыянна Бакер — Прадшколле н-р 14 у Беластоку.

**ІІ месца:** Ева Кот — Прадшколле н-р 3 у Гайнаўцы,

Рыгор Серафін — Прадшколле ў Гарадку,

Рафал Кулакоўскі — Прадшколле н-р 14 у Беластоку.

**ІІІ месца:** Якуб Рыбак — Прадшколле ў Орлі,

Соня Сульжык — Прадшколле ў Гарадку,

Габрыель Паскробка — Прадшколле н-р 3 у Гайнаўцы.

**Вылучэнне:** Адрыянна Буслоўская — Прадшколле н-р 3 у Гайнаўцы,

Марлена Крупа — Прадшколле ў Орлі,

Патрык Місяюк — Прадшколле н-р 14 у Беластоку,

Аляксандра Яроцкая — Прадшколле ў Гарадку,

Марыя Саеўская — Прадшколле ў Гарадку,

Агата Максімюк — Дом культуры ў Рыбалах.

**У катэгорыі І-ІІІ класаў:**

**Гран-пры: Магдаліна Бабік** — ПШ н-р 4 у Беластоку.

**І месца:** Лукаш Марчук — ПШ у Нараўцы,

Якуб Мацяюк — ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім,

Магдаліна Маліш — ПШ у Орлі,

Юстына Апольская — ПШ н-р 4 у Беластоку.

**ІІ месца:** Анна Недзьведзь — ПШ у Нараўцы,

Тамаш Леановіч — ПШ у Дубінах,

Марта Зінкевіч — ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім,

Дар’я Вапа — ПШ н-р 4 у Беластоку,

Філіп Хомік — ПШ н-р 4 у Беластоку,

Дар’я Маліш — ПШ у Орлі.

**ІІІ месца:** Анна Нестэрук — ПШ н-р 3 у Гайнаўцы,

Патрыцыя Зінкевіч — ПШ н-р 3 у Гайнаўцы,

Ганна Піскорская — ПШ н-р 3 у Гайнаўцы,

Наталля Весялоўская — ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім,

Уршуля Сліўко — ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім,

Юліта Вакулеўская — ПШ у Гарадку,

Данель Дэмчук — ПШ н-р 4 у Беластоку.

**Вылучэнне:** Крыстыян Грушэўскі — ПШ у Арэшкаве,

Крыстыян Вэнцко — ПШ у Нарве,

Дарота Артышук — ПШ н-р 3 у Гайнаўцы,

Лукаш Філіпюк — ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім,

Аляксандра Лажэцкая — ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім,

Дар’я Дажынка — ПШ н-р 4 у Беластоку,

Кацярына Гліва — ПШ у Храбалах,

Патрыцыя Нармантовіч — ПШ у Бабіках.

**У катэгорыі IV-VI класаў:**

**Гран-пры: Лідзія Пякарская** — ПШ н-р 4 у Беластоку,

**Якуб Андрацкі** — ПШ у Саколцы.

**І месца:** Павел Засім — ПШ у Нараўцы,

Іаанна Марчук — ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім,

Аляксандра Карпюк — ПШ у Гарадку,

Эвеліна Філіпюк — ПШ у Рыбалах.

**ІІ месца:** Юстына Давідзюк — ПШ у Рыбалах,

Матэвуш Харкевіч — ПШ н-р 2 у Гайнаўцы,

Пётр Ауксянцюк — ПШ н-р 2 у Гайнаўцы,

Аляксандра Сарокін — ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім,

Малгажата Дэмянюк — ПШ н-р 2 у Бельску-Падляшскім,

Ніна Ваўранюк — ПШ н-р 4 у Беластоку.

**ІІІ месца:** Наталля Семянюк — ПШ у Чыжах,

Паўліна Аўласюк — ПШ у Новым Корніне,

Дамініка Юшкевіч — ПШ у Нарве,

Уршуля Скепка — ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім,

Эвеліна Дзікоўская — ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім,

Эвеліна Добаш — ПШ у Орлі,

Лукаш Зіневіч — ПШ у Гарадку,

Сільвія Снарская — ПШ у Бабіках.

**Вылучэнне:** Аніта Дмітрук — ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім,

Дар’юш Бародзіч — ПШ у Бабіках,

Іаанна Леанеўская — ПШ у Нараўцы,

Паўліна Федарук — ПШ у Храбалах,

Моніка Гліва — ПШ у Храбалах,

Кшыштаф Літвін — ПШ у Залуках,

Магдаліна Васілюк — ПШ у Супраслі.

**Спецыяльная ўзнагарода: Яна Латушка** — Школа пры Расійскай амбасадзе ў Варшаве.

**У катэгорыі гімназісты:**

**І месца: Пётр Давідзюк** — Белгімназія ў Гайнаўцы,

**Марта Матысюк** — Нараўка,

**Ганна Мордань** — Белгімназія ў Бельску-Падляшскім,

**Рыгор Красоўскі** — Белгімназія ў Бельску-Падляшскім.

**ІІ месца:** Пётр Герасімюк — Белгімназія ў Гайнаўцы,

Моніка Баравік — Гімназія н-р 2 у Гайнаўцы,

Матэвуш Магрук — Белгімназія ў Бельску-Падляшскім,

Аксана Сычэўская — Гімназія н-р 7 у Беластоку.

**ІІІ месца:** Марыянна Садоўская — Нарва,

Якуб Філіпюк — Белгімназія ў Бельску-Падляшскім,

Юстына Тамашук — Белгімназія ў Гайнаўцы.

**Вылучэнні:** Патрыцыя Міхалоўская — Кляшчэлі,

Эвеліна Шыло — Чыжы,

Наталля Лаўранюк — Белгімназія ў Бельску-Падляшскім,

Юліта Грыцюк — Гарадок.

ТВОРЧАСЦЬ ГІМНАЗІСТАЎ

# Муха ціп-топ!



— 28 —

Разам з Ганкай, Соняй і Касяй мы пайшлі ў пятніцу на рок-канцэрт. Імпрэза пачыналася ў сем гадзін у адным кафэ-бары. Там мелі выступіць тры беларускія гурты. Мы апрануліся зусім звычайна, бо не хацелі выглядаць як прадстаўнікі нейкай субкультуры. Гэта была наша памылка. У кавярні я стала сябе адчуваць быццам нейкі „пакемон”. Уся моладзь была апранутая „на чорна” і амаль усе на нагах мелі чаравікі *гляны*. Я пабачыла таксама прадстаўнікоў субкультуры ЕМО (гэта скейты, якія слухаюць панк-рок). Мы занялі вольны столік. Пасля хвіліны я пабачыла, што каля нас сядзіць саліст аднаго рок-гурту і сам з сабой п’е гарэлку.

— Ён так заўсёды робіць перад выступленнем, — сказала Ганка, — толькі тады ён свабодна адчувае сябе на сцэне. Інакш ён не ўмее раскавацца!

Першыя „кавалкі” канцэрта ўсе сядзелі на месцы. Але пасля трох песень моладзь хлынула перад сцэну і стала танчыць *пога*. І мы з сяброўкамі таксама туды пабеглі. Я яшчэ ніколі не танчыла гэты танец. Спачатку я таўклася збоку, але нейкі хлапец увапхнуў мяне ў сам вір танца. Некалькі разоў нехта грукнуў у маю нагу *глянам*.

У час перапынку мы з сяброўкамі падышлі да бара. Вада, якую мы купілі, была даражэйшай за піва і яе было ў шклянцы як на лякарства. Мы ўваткнулі ў адну шклянку чатыры саломкі і быццам цмок адразу высушылі яе змесціва. Пасля чатырох порцый вады мы крыху пагасілі смагу і хацелі вярнуцца за свой столік, каб адсапціся. Аднак на нашым месцы спаў саліст рок-гурту, той самы, які раней сам піў гарэлку. А суседні столік, дзе раней сядзеў артыст, якраз занялі скейты. Сярод іх мы прыкмецілі сяброў нашага Ігара. Быў там высокі „Шчупак”, Марыюш, які заляцаўся да мяне на прэм’еры фільма аб скейтах і ўнучак нашай спадарыні Воўк. Хлопцы прыкідваліся быццам бы нас не памятаюць. Мы таксама не хацелі першымі з імі вітацца. Аднак калі ўсе мы пайшлі танчыць *пога*, скейты сталі нас таўчы локцымі і запіхваць на сярэдзіну танцпляцоўкі. І так да канца... Мы папіхаліся як нейкія таўкачы, аднак ніхто з нас не меў адвагі загаварыць.

Тэкст:<natasza9922@wp.pl>
Дызайн: <lolcia05@p.pl>

# Малітвы дзяцей!

Конкурс рэлігійнай паэзіі і прозы пачаўся па-велікоднаму. Усе ўдзельнікі (больш за паўсотні) спелі радаснае „Христос Воскресе”! Затым наймалодшыя, пад кірункам матушкі Галіны Баравік, праспявалі гімн Прасвятой Багародзіцы. Дзеткі запяялі малітву па-беларуску. І трэба сказаць, што беларуская мова найчасцей гучала на сцэне. Нашы сябры, лаўрэаты конкурсу „Роднае слова”, тут таксама былі пераможцамі. Два першыя месцы заваявалі дзяўчаткі з ПШ н-р 4 у Беластоку: Юстына Апольская (дэкламавала багародзічны верш Аляксандры Шавэла ў перакладзе Віктара Шведа „А ці бачыла”) і Лідка Пякарская, якая яшчэ раз запрэзентавала рэфлексіўны твор Ларысы Геніюш „Дзед”. Другое пачэснае месца камісія прызначыла Мар’янне Садоўскай з Нарвы за верш Мікалая Панфілюка „Хрыстос Нованароджаны”. Выступленне Мар’янны не было простым, у час першай прэзентацыі гімназістка паблытала словы. Аднак камісія належным чынам ацаніла яе цудоўную дэкламацыю і прапанавала яшчэ раз прадэкламаваць верш ніўскага карэспандэнта з Дубіч-Царкоўных.

Мы ўжо звыкліся, што навучэнцы беларускай мовы ўслаўляюць Бога на роднай мове. Таму з вялікай радасцю вітаем тых, якія не вывучаюць гэтай мовы ў школе, але выступаюць на ёй з нагоды конкурсаў і школьных святаў. Маю тут на ўвазе вучняў настаўніцы рэлігіі ў ПШ н-р 5 у Беластоку і заадно арганізаткі конкурсу Галены Добаш. Яе выхаванец Адрыян Грыцюк цудоўна прадэкламаваў верш а. Уладзіміра Місеюка „На святую Гару Грабарку”.

Самым лепшым выступленнем рэлігійнага конкурсу лічу таксама прэзентацыю Юліты Нікалаюк з ПШ н-р 4 у Беластоку. Юліта падрыхтавала верш Зьніча „Гімн пісьменнікаў”. Выступоўцы дэкламавалі яшчэ на рускай, польскай, славянскай і ўкраінскай мовах.



Дэкламуе Адрыян Грыцюк

Конкурс доўжыўся дзве з паловай гадзіны ды ацанялі яго тры камісіі. Праходзіў ён у некалькіх залах Цэнтра праваслаўнай культуры ў Беластоку, у вясновую суботу 21 красавіка. Большасць дзяцей і моладзі з павагай і заангажаванасцю выступіла на рэлігійнай сцэне. А поўны пералік лаўрэатаў мы памесцім у наступным нумары „Зоркі”.

**Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК**

## *Вершы Віктара Шведа*

### *Два погляды*

*Стаіць на дарозе хлапчына,*
*Да яго набліжаецца машына.*
*— Гэта ж не трамвай, так ці не?*
*Напэўна мяне абміне.*

*А ў той жа час вадзіцель*
*Інакш разважае быццам:*
*— Гэта ж не слуп, а мужчына,*
*І ён адысці павінен.*

### *Чаму ж не спытаў раней?*

*Прыйшоў Андрэй да Ўладка,*
*Перашкаджае ў занятках.*
*— Колькі часу? Стаў пытацца.*
*Уладак кажа: — Гадзін дваццаць.*

*Час забіваючы няспынна*
*Хутка Андрэй губляў гадзіны.*
*— Вельмі позна, сцвердзіў Андрэй.*
*— Чаму ж ты не спытаў раней?*

# *Польска-беларуская крыжаванка № 18*

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

**Адказ на крыжаванку н-р 14:** Вялікдзень, ар, ніва, фура, удача, куст, двор, ар, камандзіроўка, тэлевізар, бот, банан, яно, рака. Вера, матор, ну, мэта, ідэал, кава, неба, драч, два, адзін, ежа, віза, корань, фурор, вус, Ян, тартак, ражок.

Узнагароды, **запісныя кніжкі**, выйгралі: **Анджаліка Сапяжынская, Юстына Анішчук, Кацярына Капытка, Анна Каліноўская** з Чыжоў.



# КАМУ КУЛЬТУРА?



Ад прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі прайшло ўжо больш за год. Нібыта ў гадавіну Акту 25 сакавіка ў Варшаве чарговы раз адбыўся вялікі канцэрт, трэба дадаць — вельмі супярэчлівы, калі глянуць на фармат ды ацэнку ўдзельнікаў. Каму падрыхтаваная была гэтая ініцыятыва і хто ўвогуле з'яўляецца атрымальнікам акцый па папулярызацыі беларускай культуры? А і не менш цікава хто ў сапраўднасці і чаму паяўляецца на такіх мерапрыемствах?

Аднак варта вярнуцца да падзей некалькігадовай даўнасці. Яшчэ ў дзевяностых гадах беларускай культурай у Польшчы займалася амаль выключна беларуская меншасць. Адначасова адраджаючаяся беларускасць у самой Беларусі хутка папала ў рукі Лукашэнкі, які ўвёў свае парадкі. Пару добрых гадоў адзіным адкрытым на шырэйшую, можна нават сказаць прагрэсіўную, публіку месцам было ўрочышча Барык, дзе адбываўся фестываль „Басовішча". Пасля на польскай тэрыторыі з'явіліся „Бардаўская восень", „Беларускі андэграўнд" (тады яшчэ „Варшаўскія сустрэчы са співанай паэзіяй"), „Дні беларускай культуры" на Варшаўскім універсітэце. Усе ініцыятывы сваімі каранямі сягаюць васьмідзесятых гадоў. Паралельна людзі надалей гулялі на фальклорных фэстах. У пэўны момант колькасць беларусаў у Польшчы стала буйнець, дзякуючы эміграцыі з Беларусі. Частцы беларусаў пэўна не дазвалялі там свабодна дзейнічаць, іншыя захацелі спрабаваць новых магчымасцей і таму пачалі паяўляцца ў Польшчы. Зразу пачалі ўзнікаць новыя акцыі, перад усім у Варшаве... пікет з 5 асоб, пікет з 7 асоб, пікет з 3 асоб. Па нейкім часе хтосьці прыдумаў, што няўдалыя акцыі можна спалучыць з культурнымі маніфестацыямі і так паўсюдна пачалі па ўсёй Польшчы арганізавацца дні беларускай культуры.

Пачынаецца выспяванне зацікаўленасці не толькі рок-музыкай, але таксама літаратурай, мастацтвам. У Польшчы мяняецца падыход, даспяваюць таксама маркетынгавыя стратэгіі і даходзім да моманту, калі тысячы людзей гуляюць на Замкавай плошчы ў польскай сталіцы на канцэрце „Салідарні з Беларуссю". Кая, Вава Мафін, Маляёнак — вядомыя польскі музыканты, але дзе тут беларускасць? Пад бел-чырвонабелымі сцягамі? Частка тых, што іх купілі пэўна і не ведала, што гэта старажытны сімвал, а не побач джынсу яшчэ адзін апазіцыйны знак. Ці не знаходзімся ў пункце выхаду? Ці не трэба пачаць зноўку беларускую „адукацыю" ў Польшчы? І ці гэта сапраўды патрэбнае? Каму? Гэтыя пытанні могуць наводзіць фрустрацыю, але ёсць і група людзей, якія прынялі даволі сэнсоўную пазіцыю — захаваць элітарнасць беларускай культуры, асабліва сучаснай. Здаецца, пакуль што

працяг ☞9

# Назвы пушчанскіх мясцовасцей

Фота Аляксея Мароза



*Прафесар Міхал Кандрацюк многа часу адказваў на пытанні па гісторыі і этымалогіі названняў паасобных прыпушчанскіх вёсак*

**Пра першых пасяленцаў у Белавежскай пушчы і непасрэдным яе наваколлі, якія жылі з аховы лесу, а пасля таксама з сельскай гаспадаркі, расказаў гайнавянам навуковы супрацоўнік Кафедры беларускай філалогіі Беластоцкага універсітэта прафесар Міхал Кандрацюк у час дзвюх сустрэч (30 сакавіка і 20 красавіка) у Цэнтры прамоцыі рэгіёна „Чарлёнка". Дакладчык, засыпаны падрабязнымі пытаннямі, многа расказваў пра паасобныя пушчанскія мясцовасці. Прафесар Міхал Кандрацюк карыстаўся асабістымі матэрыяламі, сабранымі для кніжкі „Названні мясцовасцей паўднёва-ўсходняй Беласточчыны" („Nazwy miejscowe południowo-wschodniej Białostocczyzny", Wrocław 1974), у якой дадзена скарочаная інфармацыя аб паасобных пушчанскіх вёсках. Госць, ураджэнец Дубін, які зараз жыве ў Варшаве, звярнуў таксама ўвагу на змененыя польскімі чыноўнікамі назвы пушчанскіх і прыпушчанскіх мясцовасцей, якія ў многіх выпадках увогуле не супадаюць з гістарычнымі назвамі і могуць уводзіць даследчыкаў мінулага ў зман.**

Даследчык назваў мясцовасцей паўднёва-ўсходняй Беласточчыны адназначна сцвердзіў, што першым арганізаваным паселішчам, якое ўзнікла на тэрыторыі Камянецкай пушчы (пасля перайменаванай на Белавежскую — гэтая назва замацавалася ў XVII стагоддзі), было Арэшкава.

— У пачатку XVII стагоддзя паяўляецца запіс аб Арэшкавай Волі, а ў занатоўках з 1639 года — named вёскі Арэшкава, у якой жыло 25 асочнікаў і 4 чыншоўнікі. Асочнікі, якіх можам параўнаць да сённяшніх леснікоў ці гаёвых, прыбылі сюды сцерагчы каралеўскія лясы, — патлумачыў прафесар Міхал Кандрацюк. — Спачатку для аховы заходняй часткі Белавежскай пушчы дастаткова было жыхароў адной вёскі Арэшкава. Пасля сталі ўзнікаць іншыя мясцовасці, у якіх арганізавалася лясная ахова.

Больш гістарычных інфармацый дакладчык прадставіў наконт узнікнення невялікага пушчанскага пасёлка, які з часам пераўтварыўся ў Гайнаўку.

— Названне Гайнаўшчына ўзнікла ад прозвішча ляснога ахоўніка Гайныма Гэйна (Haynyma Heyno), які ў XVIII стагоддзі пасяліўся ва ўрочышчы Скарбаслаўка, побач аднайменнай рэчкі. Лес побач урочышча Гайнаўшчына сталі называць Гайнаўскай Вартай (straża). Побач яе былі яшчэ Ляснянская і Нараўчанская Варты, — заявіў прафесар Міхал Кандрацюк.

Навуковец гаварыў таксама пра пракладку чыгункі, якая стала спалучаць Гайнаўку з суседнімі гарадамі і расказаў аб узнікненні прамысловасці ў маладой мясцовасці і пазнейшым яе развіцці.

— Яшчэ ў XIX стагоддзі асноўныя жыхары Гайнаўкі жылі побач сённяшняй вуліцы Ліпавай (частка з іх займалася сельскай гаспадаркай, а частка працавала ляснымі ахоўнікамі — А. М.). У 1897 годзе была здадзена ў карыстанне чыгунка з Бельска-Падляшскага праз Гайнаўку ў Белавежу, — гаварыў прафесар Кандрацюк.

У пачатку XX стагоддзя была збудаваная чыгунка з Седлец праз Гайнаўку ў Ліду, што ўчыніла з пушчанскай мясцовасці чыгуначны вузел. Побач Царская шляху, які з бельскага напрамку ішоў праз Відава, Асоўку, Гайнаўку і Буды ў Белавежу, была збудаваная цвёрдая дарога з Бельска праз Галады ў Гайнаўку і далей у Белавежу і Пружаны. З 1915 года на тэрыторыі сённяшняй Гайнаўкі пачынае развівацца прамысловасць. Будуецца дрэваапрацоўчае прадпрыемства, узнікаюць фабрыкі вытворчасці спірту і апрацоўкі драўніны з прымяненнем хімікатаў.

— У 1921 годзе ў Гайнаўцы жыло 748 чалавек, а ў 1937 годзе ў гэтай мясцовасці было ўжо 11 тысяч насельніцтва. Перад вайной на працу ў Гайнаўку прыязджалі жыхары розных рэгіёнаў Польшчы, а пасля вайны ў горадзе сталі пасяляцца перад усім жыхары навакольных вёсак, — расказваў прафесар Міхал Кандрацюк. — Аднак у горадзе засталося мала гістарычных названняў, а назвы многіх вуліц і кварталаў гэта фантазія чыноўнікаў.

Госць спаткання гаварыў таксама пра верхнюю (горную) і ніжнюю (дольную) пасекі ў пушчы. На гэтых месцах узніклі вёскі Горнае і Дольнае, якія пасля сталі гайнаўскімі вуліцамі. Назва распаложанага побач Гайнаўкі сяла Выгода ўзяла свой пачатак ад карчмы на Царскім шляху. Непадалёк ад Гайнаўкі былі дзве вёскі — Аўгустова і Гнілец, якія зніклі. Аб іх дапытваўся гаспадар сустрэчы Мікола Бушко. Даведаўся ён, што жылі там сем'і з прозвішчамі, якія зараз можна спаткаць у яго родных Навасадах. Мясцовасць Свінарої ўзнікла хутчэй за ўсё на месцы, якое рылі свінні, а назоў пасёлка Лазіцы ўзяўся ад лазы, якая расла ў пушчы. Перад узнікненнем вёскі Дубіны (на месцы, дзераслі дубы), была ўжо Дубінская Херма (зараз: Дубінская Ферма), распаложаная побач Навасад. Удзельнікі сустрэчы даведаліся таксама, што названне Чарлёнка (ад якой выводзіцца назва Цэнтра прамоцыі рэгіёна ў Гайнаўцы) узялося ад чарляных (чырвоных) тарфовых балотаў. Распытвалі яны яшчэ пра гісторыю ўзнікнення многіх іншых сёл і этымалогію іх названняў. Адказваючы на пытанні прафесар Міхал Кандрацюк заявіў, што нельга гаварыць аб дамінацыі нейкага з трох накірункаў (гродзенска-ваўкавыскага, валынска-брэсцкага і мазавецкага), з якіх прыходзілі пасяленцы на тэрыторыю Белавежскай пушчы.

У час спаткання прафесар Міхал Кандрацюк паінфармаваў, што працаваў для Камісіі ўстанаўлення названняў мясцовасцей і фізіяграфічных аб'ектаў, якая дзейнічала пры Установе Рады Міністраў і займалася апрацоўкай названняў на польскай мове. Разам з іншымі навуковымі супрацоўнікамі збіраў ён матэрыялы наконт паасобных назваў сёл у архівах і гаворках вёсак Беласточчыны і перадаваў іх у згаданую камісію.

— Мы прапанавалі чыноўнікам Камісіі ўстанаўлення названняў мясцовасцей і фізіяграфічных аб'ектаў, каб частцы мясцовасцей Беласточчыны вярнуць гістарычныя назвы, але нас не паслухалі. Тлумачылі нам, што названні мясцовасцей мусяць быць на чыстай польскай мове, — сказаў прафесар Міхал Кандрацюк, якога ў мінулым абвінавачвалі ў тым, што не дапільноўваў, каб на Беласточчыне засталіся гістарычныя названні мясцовасцей. — У некаторых назвах сёл было цалкам зменена значэнне паасобных састаўных слоў. Я пісаў польскім чыноўнікам аб няправільнасцях на Беласточчыне, але мае заўвагі не браліся пад развагу. Напрыклад, сённяшняе названне „Sawiny Gród" абсурднае і паказвае, што быццам бы там раней было нейкае гарадзішча, што не супадае з праўдай. Гэта было вышэйшае месца на багнах (груд), дзе прабывалі совы.

Прафесар Міхал Кандрацюк лічыць, што трэба выступаць за вяртанне гістарычных названняў мясцовасцей на Падляшшы, але для гэтага патрэбная згода мясцовага насельніцтва.

— У Бяшчадах украінскія названні мясцовасцей былі замененыя польскімі і цяпер вяртаюцца там да старых назваў, а ў нас гэтага не робіцца. Я гаварыў з жанчынай з гміннай рады на Гайнаўшчыне, але яна пераконвала, што найважнейшая для грамадства будова дарог. Падобна ставяцца да гэтай справы іншыя мясцовыя чыноўнікі. Без згоды мясцовага насельніцтва не зможам змяніць назвы сёл і таму гэтай справай павінна заняцца інтэлігенцыя. На маю думку намнога лягчэй вярнуць гістарычнае названне на польскай мове, чым увесці другія названні на беларускай мове, да якіх таксама неперакананыя мясцовыя чыноўнікі на Гайнаўшчыне, — заявіў прафесар Міхал Кандрацюк.

**Аляксей МАРОЗ**

# Мёртвая ціш у Беларусі

**„Ажыццяўленне ідэі дэмакратызацыі і захоўвання правоў чалавека ў Беларусі" — пад такім лозунгам вялася дыскусія на юрыдычным факультэце Беластоцкага ўніверсітэта. — У Беларусі не спрацоўвае ні адзін з інструментаў патрэбных для будовы дэмакратыі, — былі згодныя ўдзельнікі ўніверсітэцкай канферэнцыі. Асцерагалі яны, што ў палітыцы ў дачыненні да Беларусі шмат небяспек можа стварыць рэстрыкцыйная рэалізацыя Польшчай Шэнгенскага дагавора.**

З ідэяй такой навуковай дэбаты выступілі студэнты. Канчаткова рэалізавалі яе Асяродак замежнай палітыкі, Інстытут еўрапейскага права і Навуковае кола еўрапейскага права Беластоцкага ўніверсітэта. З увагай прыслухоўваўся ім таксама консул РБ у Беластоку Вадзім Палякоў. На думку доктара Яцка Ціхоцкага, дырэктара Асяродка ўсходніх даследаванняў, адной з асноўных умоў развіцця дэмакратыі ў Беларусі з'яўляецца развіццё самога грамадства:

— Заўжды накінутае зверху будаванне дэмакратыі кончылася фасадна, не ўплывала ў сапраўднасці на змену палітычнай сістэмы.

Перасцярог ён перад увядзеннем уязных абмежаванняў у Польшчу пасля ўступлення ў сілу ў наступным годзе ў нашай краіне Шэнгенскага дагавора (які забяспечвае ад міграцыі з з-па-за ўрасаюзных краін):

— Павінна быць лягчэй з атрыманнем візы камусьці, за кім няма злачынных дзеянняў.

Падкрэсліў ён таксама:

— Дэмакратыю могуць будаваць людзі свабодныя і незалежныя таксама фінансава. У Беларусі ж маем дэфіцыт прыватнай уласнасці. Трэба падтрымліваць і пераконваць беларускія ўлады да гарантавання прыватнай уласнасці, якая ў выніку стала б падставай для будавання дэмакратыі.

На думку шэфа Асяродка ўсходніх даследаванняў, трэцяй умовай развіцця беларускай дэмакратыі з'яўляецца прымяненне прынцыпу „першынство законаў перад кожнай уладай":

— Трэба памагаць беларусам шляхам розных форм юрыдычнай асветы. Не можам аднак пазбавіць Беларусь эліты, фундуючы стыпендыі маладым і пакідаючы іх па-за Беларуссю.

Праф. Анджэй Жэплінскі з Варшаўскага ўніверсітэта, сакратар Хельсінскага фонду правоў чалавека ў Польшчы адзначыў:

— Зусім не вырашана, што Беларусь стане часткай еўрапейскай дзяржавы. Гэта было б, вядома, стратай для беларусаў хоць бы і з нашага, польскага, пункту гледжання. Можа быць яна часткай расійскай імперыі, часткай усходняй Еўропы. Мы, палякі, натуральны інструмент, які памагае Беларусі еўрапеізавацца. Шэнгенскі дагавор яшчэ паглыбіць гэты падзел.

Заўважыў ён:

— Ёсць шэраг краін, якія былі прынятыя ў Савет Еўропы „ў крэдыт", асабліва з былога СССР.

На яго думку, ёсць тры берагавыя ўмовы, якія вырашаюць аб дэмакратычнай і прававой дзяржаве. Першая з іх гэта панаванне палітычнай дэмакратыі, падставай якой з'яўляюцца рэгулярна праводжаныя кожныя пару гадоў выбары з удзелам канкурыруючых паміж сабой партый роўных шанцаў. Другая — трывалае становішча прававога кіравання, дзе кожная ўлада абмежаваная, а судовы лад поўнасцю незалежны, які трэба поўнасцю захоўваць таксама і перад ім самім. Трэцяя — захоўванне г.зв. асноўных правоў і свабод пры моцна ўкаранелым адкрытым грамадстве, якое не мусіць шукаць ратунку ў судах:



*Выступае праф. Анджэй Жэплінскі з Варшаўскага ўніверсітэта, сакратар Хельсінскага фонду правоў чалавека ў Польшчы*

— Ёсць яшчэ чацвёртая ўмова, незапісаная: свабодны рынак. Неабходнае ўшанаванне прыватнай уласнасці. Моцная дзяржаўная ўласнасць гэта слабое адкрытае грамадства, у якім спрыяльныя ўмовы для карупцыі. Ні адну з гэтых умоў Беларусь не выконвае і не хоча выконваць. Без лідэраў грамадства не зможа патрабаваць захавання сваіх правоў. Больш энергічныя беларусы з'ехалі на Захад, шмат іх таксама ў Расіі, дзе падмацавалі Маскву. На Беларусі, калі хочаш мець грошы, ты прымушаны абмануць дзяржаву.

Праф. Жэплінскі звярнуў яшчэ ўвагу на недахоп у Беларусі акадэмічнай, прафсаюзнай і рэлігійнай свабод (гэта кранае нават Царкву, якой аўтакефалію блакіраваў КДБ).

— Маем у Беларусі з'яву „мёртвай цішы".

У сваю чаргу Владзімеж Цімашэвіч, які цяпер узначальвае Асяродак замежнай палітыкі Беластоцкага ўніверсітэта, таксама падзяліўся з журналістамі сваімі меркаваннямі:

— Я прыкмячаю ўзрастаючую ў Еўропе збянтэжанасць; палітыка, якую вялі дагэтуль Еўрасаюз, Савет Еўропы, Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе адносна нашага ўсходняга суседа не прыносіць вынікаў, няшмат там мяняе. З другога, аднак, боку штосьці там здарылася, незалежна ад дэмакратычнай Еўропы. Маю тут на думцы эканамічныя расійска-беларускія адносіны. Змены, якія наступілі пару месяцаў таму і якія пазбавілі Беларусь вялікай часткі прыбыткаў ад вельмі штучна наладжаных умоў гандлёвавага абмену паміж Расіяй і Беларуссю, мусяць пакінуць адбітак не толькі на эканоміцы гэтай краіны, але ў выніку і на ўмовах жыцця прынамсі часткі грамадства. Беларуская дзяржава, як было да гэтай пары, можа не справіцца з усімі сваімі абавязацельствамі, такімі як зарплаты ці пенсіі. Гэта ў сваю чаргу можа выклікаць палітычныя паслядоўнасці.

Былы прэм'ер і міністр замежных спраў адзначыў, што не прыкмячае польскай усходняй замежнай палітыкі, хоць, калі гаворка аб Беларусі ў мінулыя гады, поруч з Літвой Польшча была найбольш актыўнай заступніцай г.зв. беларускай справы і — шырэй — прынцыпаў палітыкі суседства на еўрасаюзнай арэне:

— У значнай часткі нашы пастулаты не прымаліся пад увагу. На маю думку м.інш. таму, што шмат дзяржаў заходняй Еўропы, нашых сяброў і партнёраў, не хацеўшы псаваць сваіх адносін з Масквой, палічылі за лепшае не ўваходзіць на абшар патэнцыяльных канфліктаў у інтарэсах.

Экс-міністр дадаў, адказваючы „Ніве":

— Расія — вельмі важны партнёр у гэтай частцы свету і трэба з ёю размаўляць, што не абазначае прызнаваць яе прэтэнзіі на нейкія асаблівыя правамоцтвы ў гэтым суседстве. Цяжка зразумець, нават не адобрыць, такі погляд, што меркаванне Расіі на тэму таго, што дзеецца ў Еўропе, не павінна прымацца пад увагу. Гэта так, калі б сказаць Польшчы, што яе меркаванні наконт гэтых спраў не павінны прымацца пад увагу...

Не дабраліся на канферэнцыю прадстаўнікі навуковага асяроддзя Гродзенскага дзяржуніверсітэта імя Янкі Купалы. Затое прыехала доктар Ала Сакалова, кіраўнік кафедры міжнароднага і еўрапейскага права Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта ў Вільні (у эміграцыі):

— За час гэтай канферэнцыі я зразумела, што справы Беларусі, асабліва памежных тэрыторый для палякаў вельмі цікавыя. Не здзіўляе гэта, паколькі мы стагоддзямі былі ў адной краіне: у Рэчы Паспалітай, пасля ў Расійскай імперыі, да таго ў Вялікім княстве Літоўскім, — сказала ва ўніверсітэцкіх кулуарах. — Ірацыянальна адчуваю, што ў Беларусі „кола" замкнутае, вельмі доўга выразных змен у Беларусі не пабачым. Рацыянальна затое адчуваю, што змены мусяць наступіць. Як выйсці з гэтага „кола", на маю думку, на гэтае пытанне адказу няма. Усе гэтыя ідэі — аб правах чалавека, свабодах — функцыянуюць сярод маладых людзей. Больш таго — дзяржаўная адміністрацыя таксама аб іх ведае. Застаецца пытанне: як іх рэалізаваць, — бо ж не дзейнічае ні адзін інструмент для іх рэалізацыі. Канстытуцыйны суд мае невялікія паўнамоцвы, СМІ — самі ж ведаеце, якая ў іх сітуцыя. Толькі змена свядомасці, ментальнасці, збудаванне ўстаноў прававой культуры дасць магчымасць пераломy. А гэта вельмі доўгі шлях.

**Тэкст і фота Раіны СТЭФАНЧУК**

8 ☞працяг

# КАМУ КУЛЬТУРА?

няма лепшага выхаду, прынамсі да часу, калі адбудуцца відавочныя змены сярод беларусаў. Усе навокал кажуць, што гэта справа некалькіх гадоў, але і пяць гадоў таму казалі тое ж.

На такую канстатацыю дазваляю сабе пры нагодзе чарговых беларускіх дзён. Упершыню наладзілі іх студэнты Галоўнай гандлёвай школы ў Варшаве. Нібыта ўсё нармальна, дзень з эканоміяй, як і патрабуе характар самой установы, але і дзень з культурай. На жаль, арганізатары забыліся, што сёння адны даклады не цікавяць случачоў, а ўжо напэўна не эканамістаў. Пра рэкламу таксама яны забыліся. У тэме Беларусі недастаткова проста паставіць толькі інфармацыйную дошку ў школе. Як мне прызналася Кася Быляк, галоўны арганізатар, яны самі не вельмі зарыентаваныя ў сітуацыі Беларусі — гэта ж іх першая такая ініцыятыва. Пры гэтай нагодзе найбольш ім залежала, аднак, на інтэграцыі беларускіх студэнтаў, якіх, аказваецца, шмат у іхняй школе. Студэнты ахвотна тут прыязджаюць і не патрэба нават праграмы Каліноўскага, хаця — як мне сказаў адзін з беларускіх першакурснікаў — сярод абедзвюх груп відаць вялікую розніцу ў падыходзе да сваёй беларускасці. Непакоіць, але і не здзіўляе яго да канца факт, што ў час дакладаў прысутнічалі перш за ўсё арганізатары і запрошаныя пры гэтай нагодзе студэнты з Гродна. Усё ж такі не можа ён зразумець, чаму ў свабоднай дзяржаве маладыя студэнты не паказваюць увогуле сваёй беларускасці і зусім не цікавяцца беларускімі мерапрыемствамі, асабліва дзяўчаты, якія хутчэй пойдуць у клуб, чым на беларускі канцэрт. Прыязджаюць яны ў Польшчу, каб тут астацца або ехаць далей, зрэдку думаюць пра вяртанне. Янэк, беларускі студэнт кажа, што ў меркаванні многіх надзеяй на адраджэнне беларускай культуры аказваецца Мінск. Ад Янка пачула я таксама іншае цікавае меркаванне. Не любіць ён, калі беларускае грамадства дзеляць на дзве часткі: прыхільнікаў улады, або тых, якія з апазіцыяй. Янэк бачыць будучыню ў эканамічных катэгорыях. Не разумее ён чаму ўвага не адводзіцца на прафесійнасць дзеяння, што відавочна і ў працы апазіцыі, але і ў працы беларусаў у Польшчы. Ці такім чынам патрэбнае „мастацтва дзеля мастацтва"? Няма ўжо зашмат часу разглядаць падставовыя пытанні.




**Ілона КАРПЮК**

## Pavietra www.pavietra.org

**http://www.pavietra.org**

Беларускае сеціва ўсё больш папаўняецца рознымі сайтамі агульнаграмадскай тэматыкі. Усяму новаму, як і мае быць, пракладвае шлях у віртуальную прастору моладзь. Магчыма, не ўсё атрымліваецца з першага разу, але галоўнае пачаць, бо гэта значыць — зрабіць паўсправы.

Адной з такіх спроб, прычым даволі ўдалай, можна назваць сайт „Паветра", ці, як яго называюць стваральнікі — „Сайт вольнай моладзі". Месціцца ён у Сусветным павуцінні па адрасе http://www.pavietra.org.

Дызайн сайта крыху стракаты. Блакітна-бела-сінія фарбы неяк не даюць погляду сканцэнтравацца на чымсьці адным. Думаецца, гэты недахоп аўтары партала здолеюць выправіць, калі зразумеюць, што галоўная старонка не мусіць быць падобнай на звычайны інтэрнэт-форум.

Адкрыццё сайта адзначана не зусім звыклым павольным з'яўленнем выяўлення. На пачатку гэта крыху раздражняе. Але вельмі хутка прыходзіш да высновы, што менавіта такая задумка сведчыць аб тым, што распрацоўшчыкі стараліся, каб іх віртуальныя наведвальнікі набраліся цярпення пры знаёмстве з сайтам.

„Паветра" падзеленае на традыцыйныя тры часткі. На першай старонцы, як звычайна, месцяцца навінныя паведамленні. Нічога арыгінальнага ў іх няма — ёсць яны, з большага, папросту перадрукоўкай навін з іншых інфармацыйных парталаў. Праўда, лічыць гэта нечым кепскім не выпадае. Жыццё ў Беларусі рэзка падзеленае на афіцыйнае і неафіцыйнае. Першае моладзі не вельмі цікавае, бо пра яго вядома добра і говорыцца аб ім „з кожнага праса". Жыццё неафіцыйнае, значыць, апазіцыйнае — не надта бурлівае. Яно не адразу кідаецца ў вочы і для пераважнай большасці насельніцтва невядомае, а тых, хто займаецца яго асвятленнем не надта многа. Таму неафіцыйная інфармацыя распаўсюджваецца моцнымі інтэрнэт-парталамі кшталту „Хартыі 97" ці „Радыё Свабода". З гэтых крыніц і чэрпаюць напаўненне сваіх рубрык такія маладзёжныя сайты як „Паветра".

На даным сайце рубрык не так ужо і мала. Праўда, не ўсе яны працуюць. Вельмі шкада, што дагэтуль не дайшлі ў распрацоўшчыкаў рукі да рубрык „Інфармацыя" і „Нумары". Сайту бракуе інфармацыі аб яго аўтарах, яго мэтах і задачах. Менавіта гэтыя звесткі варта было б размясціць у „Інфармацыі", бо, як сведчаць паведамленні з іншых інтэрнэт-крыніц, даны сайт ёсць у нейкім сэнсе электроннай версіяй газеты „Паветра". З чаго вынікае, што ў „Нумарах" мусяць быць яе віртуальныя копіі. Праўда, што гэта за газета і дзе выдаецца засталося невядомым. Значыць, аўтарам і распрацоўшчыкам няблага было б распавесці аб гэтай акалічнасці хаця б пад назовам сайта.

Нядрэннай падаецца працуючая рубрыка „Фотаальбом". Тут месцяцца здымкі з розных акцый і падзей, дзе пабывалі датычныя да сайта хлопцы і дзяўчаты. Таксама можна пабачыць выяўленні краявідаў і родных сэрцу аўтараў мясцін.

Паколькі сайт толькі нядаўна з'явіўся ў Байнэце, распрацоўшчыкам залежыць на тым, як да яго ставяцца віртуальныя наведвальнікі. Для гэтага яны вядуць апытанне. Згодна яго вынікам пераважае нармальнае і добрае стаўленне да партала. Гэта мусіць даць знаць яго аўтарам, што яны на правільным шляху ў Інтэрнэт.

**Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ**



## Беларусь, беларусы...

**Беларускія каўказцы**

На пачатку падвядзем вынікі чэмпіянату Еўропы па цяжкай атлетыцы, пра які ўжо расказвалася ў папярэднім нумары. У апошнія дні беларусы здолелі яшчэ адзначыцца медалямі ў двух катэгорыях. Вызначыліся маладыя Кацярына Шкуратава — сярэбраны медаль у супервагавай жаночай кампаніі і Вадзім Стральцоў — бронза сярод атлетаў да 85 кілаграмаў.

19-гадовая Шкуратава нядаўна ўвайшла ў гурт дарослых, а яе прагрэс абнадзейвае — прынамсі ў Страсбургу вышэй яе апынулася толькі ўкраінская прадстаўніца з адпаведным прозвішчам — Каробка, якая была цяжэй нашай суайчынніцы ажно на 66 (!) кілаграмаў. Іншая беларуска, якой належаць нацыянальныя рэкорды — Тацяна Грамыка свайго максімуму не паказала і заняла на еўрапершынстве 4-е месца. 20-гадовы магілёвец Стральцоў, які на апошнім чэмпіянаце свету быў пятым, зараз разам з румынскім і турэцкім штангістамі паказаў лепшую суму, а месцы на п'едэстале размяркоўваліся паводле вагі спартоўцаў — Вадзім быў цяжэйшым. Дадам, што ў гэтай вагавай катэгорыі ў Беларусі ёсць яшчэ Андрэй Рыбакоў, віцэ-чэмпіён апошняй алімпіяды, мінулагодні пераможца чэмпіянату Еўропы. Годна выступаў у катэгорыі да 77 кг, дзе вельмі прадстаўнічая кампанія, Мікалай Чарняк, яшчэ адзін беларускі малады талент — да трэцяга сумарнага месца яму забракла толькі аднаго кілаграма. А вось сярод суперцяжаў беларускія штангісты-мужчыны не выступалі — можна толькі з настальгіяй успамінаць выдатныя гістарычныя дасягненні Валерыя Шарыя, Леаніда Тараненкі, Аляксандра Курловіча.

Усяго ж на рахунку Беларусі па выніках першынства старога свету пяць медалёў у алімпійскім двухбор'і і дзевяць у асобных практыкаваннях. Паводле вартасці медалёў наша каманда на восьмым месцы, а па суме ўзнагарод (14) — на чацвёртым. Вышэй толькі Расія, Арменія і Украіна. Так што настрой на чэмпіянат свету ў Тайландзе, дзе будуць разыгрывацца пекінскія ліцэнзіі, даволі аптымістычны.

Паралельна ў Сафіі прайшоў чэмпіянат кантынента па барацьбе. Упершыню за апошнія гады беларускія барцы грэка-рымскага стылю засталіся за рысай прызёраў. Лепш за іншых нашых „класікаў" выступіў 30-гадовы Юрый Дубінін, які стаў пятым у катэгорыі да 60 кг — вышэйшы вынік у яго кар'еры. Вынікам каманднага правалу стала ганебнае агульнае 17-е месца. Падобна на тое, што лепшыя традыцыі айчыннай барацьбы застаюцца толькі ўспамінам. Лепш справы склаліся ў барцоў-вольнікаў. Гонар краіны ўратавалі выхадцы з Паўночнага Каўказа, якія некалькі гадоў таму прыехалі выступаць за Беларусь. Альберт Батыраў стаў чэмпіёнам у катэгорыі да 66 кг, у фінале адолеўшы прадстаўніка Расіі. Яшчэ адзін „гарачы хлопец" Руслан Шэйхаў стаў сярэбраным лаўрэатам у вазе да 96 кг. Блізкі да бронзы быў Сяргей Борчанка, якому перашкодзіла сур'ёзная траўма, атрыманая на турніры. З усіх уласна беларусаў п'едэстала дасягнула толькі Ірына Цыркевіч, якая другі год запар заняла трэцяе месца ў жаночай катэгорыі да 67 кг. Іншыя ж нашы дзяўчаты пацярпелі фіяска.

**Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ**

# Адкажыце нам, паважаныя чыноўнікі...

**Мікіта Дрозд у допісе „Нашы чыноўнікі проста саромеюцца" („Ніва" № 13 ад 1.04.2007 г.) паказвае як беларусы ставяцца да сваёй тоеснасці. Праўда, гэтую тэму я раней уздымаў на старонках тыднёвіка і не стаў бы да яе вяртацца, калі б аўтар не выклікаў мяне да дошкі. А напісаў ён так: „Прапаную (...) Уладзіміру Сідаруку, каб ён праверыў (...) колькі кніжак на беларускай мове купіла гміна на працягу 4-6 гадоў у школьную, гмінную і філіяльныя бібліятэкі, ці ў гэтых культурных кропках знаходзіцца „Ніва" і іншыя беларускія выданні для агульнага карыстання". Раней чым адкажу на пытанні шаноўнага аўтара, спашлюся на публікацыю І. Карпюк „Дзе беларускія кніжкі?" („Ніва № 13 ад 1.04.2007 г.). Журналістка тры дні падарожнічала па бібліятэках і займалася справай чытальніцтва. Пабывала і ў Чаромсе. „Няпраўдай было б сказаць, — піша Ілона Карпюк, — што ўсюды цалкам наракалі. Задавальненне на твары і ў голасе пачула я ў Нурцы-Станцыі і Чаромсе. З усмешкай на твары бібліятэкары расказвалі мне пра стабільнасць сітуацыі. Не маглі, на жаль, пахваліцца колькасцю кніжак на беларускай мове".**

Я са свайго боку магу прыкінуць некалькі даных па чытальніцтве ў Чаромсе. У сямідзесятых гадах гмінная (сумесна з чыгуначнай) бібліятэкі налічвалі 374 кніжкі на беларускай мове. Зарэгістраваных было дзесяць сталых чытачоў беларускай літаратуры. У асноўным былі гэта вучні белліцэяў з Гайнаўкі і Бельска-Падляшскага. Найбольшай папулярнасцю карысталася белетрыстыка, асабліва раманы. У 1999 годзе лік кніжак панізіўся да 300 экземпляраў. Тры гады пазней Чаромхаўская бібліятэка налічвала 380 фаліянтаў. На закупку новых кніжак у 2002 годзе было выдадзена 9 157 зл. і 1 906,30 зл. на часопісы. На жаль, у ліку 29 перыядычных найменняў не было „Нівы". З пакупкай беларускай літаратуры, як тлумачыла тадышняя загадчыца бібліятэкі, узніклі праблемы. Найбольш складанай справай было тое, што адзіную кнігарню з беларускай літаратурай па вуліцы Кілінскага ў Беластоку ліквідавалі, а новай не адкрылі. Варта прыкмеціць, што мясцовыя радныя ў 1999-2002 гадах (па ацэнцы бібліятэкаркі) не шкадавалі грошай на кніжкі і падпіску прэсы, бо ў сярэднім прызначылі на гэтыя мэты каля 15 тысяч злотых.

А як справа маецца цяпер? Беларускі кнігазбор налічвае 350 кніжак. У 2005 годзе было зарэгістраваных пяць сталых чытачоў беларускай літаратуры, якія прачыталі ў год... па адной кніжцы. У мінулым годзе лік чытачоў павысіўся да дваццаці, а лік прачытаных кніжак — да дваццаці пяці. Як мне сказала загадчыца Чаромхаўскай бібліятэкі Тамара Кердалевіч, на закупку новых кніжак у 2005 годзе было прызначаных 5 тыс. зл., а ў мінулым — 4 142 зл. Сёлета на гэтую мэту будзе адведзена больш за тры тысячы злотых. Ці папоўніцца беларускі кнігазбор, дык цяжка сказаць. Адно стала пэўным, на падпіску „Нівы", як і раней, так і зараз, не хапіла грошай.

— Адсутнасць беларускай класікі ў кнігарнях, — канстатавала Тамара Кердалевіч, — гэта адвечная праблема. Кнігазбор, якім карыстаемся, ужо састарэўся. У 2003 годзе дэлегацыя з РБ перадала ў падарунку войту Міхалу Врублеўскаму кніжку „Памяць. Мастоўскі раён" з дароўным надпісам: „Паважаным гаспадарам з павагай і любоўю ад удзячных суседзяў-беларусаў — жнівень 2003 г." На Фолькавых сустрэчах 24.05.2005 года чарамшане атрымалі ад дэлегацыі з Кобрына Камянецкага раёна кнігу „Памяць. Камянецкі раён". Абедзве кніжкі знаходзяцца ў бібліятэцы. У мінулым годзе прафесар Галіна Тварановіч перадала больш за тысячу кніжак, выдадзеных Беларускім літаратурным аб'яднаннем „Белавежа". Гэта самы каштоўны падарунак, бо такіх кніжак якраз патрабуюць чытачы, у тым ліку студэнты вышэйшых навучальных устаноў. Кніжкі, якія ад імя Праграмнай рады тыднёвіка „Ніва" перадала Ілона Карпюк таксама папоўнілі чаромхаўскі кнігазбор і лічацца каштоўным набыткам, на які прыйшлося б чакаць гадамі. А бібліятэцы Пачатковай школы няма чым пахваліцца. Налічвае яна 172 тамы беларускай літаратуры і 69 падручнікаў па беларускай мове, якімі сёлета карыстаецца дваццаць дзетак. На ўрокі ў двух групах адводзіцца штотыдзень шэсць гадзін. Дырэктар школы заявіла, што навучанне роднай мове ў Чаромсе не спыніцца, а лік дзетак на занятках павялічыцца. Хацелася б такога пажадаць і іншым школам, але, ці гэта магчыма? Памойму, поспех будзе залежыць таксама ад мясцовых старастаў, бурмістраў і войтаў. Затым адкажыце, паважаныя чыноўнікі, як вы паставіцеся да нашай супольнай беларускай справы?

**Уладзімір СІДАРУК**

# Што з арлянскай сінагогай?

Ад заканчэння другой сусветнай вайны Вялікая сінагога ў Орлі, помнік нулявога класа, да паловы мінулага года выкарыстоўвалася ў якасці склада. Пры камуне захоўваліся тут саламяныя каробкі, пазней лясныя дары, а ў апошніх гадах сцёкавыя трубы, фатэлі на патрэбы фэстаў ды іншыя прадметы не звязаныя з аб’ектам. Ранейшыя гмінныя ўлады не былі зацікаўлены прыцягненнем масавага наведвальніка да помніка мінуўшчыны. Я — супрацоўнік Грамадскага камітэта ўшанавання некраполій і памятак яўрэйскай культуры ў Польшчы — быў іншага меркавання: наша мінулае павінна быць нашым гонарам і козырам, павінна служыць папулярызацыі нашай гміны.




У чэрвені 1999 года, па маім хадайніцтве, падляшскі ваяводскі захавальнік помнікаў даўніны правёў агляд арлянскай сінагогі, у выніку чаго гмінныя ўлады спынілі вытворчасць бетонных матэрыялаў на пляцы перад сінагогай і кампенсавалі раскрадзеныя сцёкавыя трубы. За наступныя два гады аб’ект атрымаў абноўленую аконную сталярку ды сталёвую агароджу.

Чарговы агляд захавальнік правёў 6 лютага 2002 года. Я спадзяваўся больш рашучых крокаў у напрамку аховы сінагогі, бо паслярамонтнае выкарыстоўванне помніка побыту яўрэяў у нашай частцы Рэчы Паспалітай у якасці склада лічыў недарэчнасцю. Аднак той агляд нічога не даў, бо тадышні войт не захацеў вывесці адтуль таго барахла, а захавальнік меркаваў расчысціць аб’ект у момант запуску работ па прыстасаванню сінагогі для масавага наведвання. Тады я, за падказкай ваяводскай інспектар аховы помнікаў Евы Цэльнэр-Наралеўскай, звярнуўся за такім запускам у Бельскае павятовае старостава, аднак адтуль не атрымаў нават адказу. Агляд аказаўся безвыніковым і ў іншым плане: нікога не турбавала працякаючая чарапіца, праз якую сырасць выйшла навонкі будынка (пісала пра гэта „Ніва” ад 14 красавіка 2002 года).

Чарговыя гмінныя ўлады не клапаціліся пра стан гістарычнага аб’екта. Але вось тое, на што не падзейнічалі рэстаўрацыйныя агляды, „ад рукі” аформіў новы арлянскі войт Пётр Сэльвясюк. Ён задаволіў маё чарговае хадайніцтва і, карыстаючыся дапамогай бельскіх пажарнікаў, прычыніўся да рамонту пашкоджанага даху.

Пра цяперашні стан арлянскай сінагогі я інфармаваўся ў войта Сэльвесюка. Прыводжу галоўныя пункты:

— у выніку пастановы Рэгуляцыйнай камісіі па справах яўрэйскіх верніцкіх абшчын ад 7 лютага 2001 года пачалася рэгуляцыйная працэдура пераводу ўласнасці арлянскай нерухомасці з гістарычнай сінагогай у карысць Яўрэйскай верніцкай абшчыны ў Варшаве. Зараз нерухомасць з’яўляецца ўласнасцю казны пад уладаннем Гміннай управы ў Орлі;

— з днём запуску рэгуляцыйнай працэдуры ўсе судовыя і адміністрацыйныя працэсы адносна разгляданага аб’екта спыняюцца;

— да часу ўрэгулявання юрыдычнага стану і заключэння магчымай дамовы з новым уладальнікам нельга прымаць мер у напрамку ўстойлівага загаспадарання аб’екта. Мэтай цяперашніх дзеянняў Гміннай управы з’яўляецца забеспячэнне будынка шляхам рамонту даху, кампенсацыі вадасцёкавых труб, забеспячэнне інтэр’ера і атачэння сінагогі; на гэта ёсць дазвол ваяводскага захавальніка помнікаў ад 25 студзеня 2007 года. Работы рушаць пасля атрымання на гэта сродкаў з фонду Польская вёска 2000 імя Мацея Ратая; заяўка на гэта пададзена 15 лютага 2007 года. Штогод у вясеннелетні сезон праводзіцца парадкаванне наваколля сінагогі;

— па пастанове згаданай Рэгуляцыйнай камісіі ад 4 жніўня 2002 года пачаўся рэгуляцыйны разбор такога ж пераводу ўласнасці нерухомасці, на якой да 1939 года быў кіркут. У гэтым выпадку немагчыма трасіраваць дарогу, якая прылягае да згаданай нерухомасці; справу занядбалі ранейшыя гмінныя ўлады (пра гэта пісала „Ніва” ад 15 снежня 1999 года).

Я настойваю за тое, каб мінулае нашых яўрэяў скарыстаць для прапагандавання Орлі. Дзеля гэтага можна прыняць розныя меры, напрыклад, вызначыць турмаршрут ці выпусціць паштоўкі з выявамі захаваных яўрэйскіх памятак. Вось я ў мінулым годзе за свой кошт выдаў такую каляровую аўтарскую паштоўку. Яны разышліся па свеце, у тым ліку трапілі і ў Ізраіль.

У сінагозе нават цяпер, калі не закончаны рамонт інтэр’ера, можна было б адкрыць невялікі музей з экспазіцыяй яўрэйскай культуры ды этнаграфічную выстаўку з магчымасцю куплі вырабаў мясцовага рукадзелля. Спадзяюся, што новыя гмінныя ўлады паставяцца прыхільна да гэтай задумы.

**Тэкст і фота Міхала МІНЦЭВІЧА**

# У імя жыцця

На маляўнічай ускраіне Белавежскай пушчы, пры скрыжаванні вуліц 3 Мая і Рэя горада Гайнаўкі, знаходзяцца з левага боку каталіцкі, а з правага боку праваслаўны могільнікі. Пасярэдзіне абодвух некраполій — быццам ахінуты братнімі душамі — раскінуўся могільнік савецкіх салдат і партызан з помнікам, да якога вядзе дарожка сярод гонкіх сосен. Пакояцца тут вечным сном салдаты перамогі, якія абаранілі свет ад фашызму. Засталіся яны тут назаўсёды, не дачакаўшыся вяртання да сваіх маці, бацькоў, дзяцей, да сваіх дамоў, адкуль выйшлі на вайну ці ў партызаны.



*Помнік салдатам Савецкай Арміі ў Гайнаўцы*

Для жыхароў Гайнаўкі могільнік, на якім пакояцца астанкі паўшых у баях у час II сусветнай вайны салдат розных нацыянальнасцей — месца святое. Штогод ветэраны вайны, моладзь, гайнаўяне спатыкаюцца ў гэтым месцы на Провады, у Дзень Перамогі (9 мая) і ў памінальныя суботы, каб пакланіцца праху салдат і аддаць ім пашану за тое, што ахвяравалі сваім жыццём дзеля міру на зямлі. Вайна для гэтых салдат закончылася тут, на Гайнаўшчыне.

**Тэкст і фота Віктара БУРЫ**

# Коцік і бласлаўленне

Называла яго коцікам, а каханне між імі выглядала як у кніжным рамане. Жанчына была адукаваная, бо пры цары закончыла амаль настаўніцкую семінарыю. Была яна вельмі начытаная і выдатна гаварыла па-польску і па-руску. Хадзілі чуткі, што зараз пасля вайны дапамагала некаторым вучням завяршыць навуку і атрымаць атэстат сталасці. Былі гэта добрыя людзі.

Аднойчы я, як пісьманосец, нешта ім нёс, магчыма „Ніву”. Але перад парогам пачуў я ейны громкі голас, быццам нейкае „бласлаўленне”, а гэтак яна, адукаваная, так свайго мужа-коціка сцёбала моцным слоўцам. Сыпаліся такія „вучоныя” словы, якіх не магу паўтарыць; тых слоў няма ў ніводным прыстойным слоўніку. Муж, які быў таксама гарачы і моцных слоў не шукаў далёка, мармытаў нешта, але здаючыся, а яна яго брала як Сідараву казу.

Што ж, я, пастаяўшы крыху пад дзвярмі, каб не перашкаджаць добрай „адукацыі” і „бласлаўленню”, ціха ўторкнуў газету ў дзверы і асцярожна пайшоў у сваю дарогу.

**Мікалай ПАНФІЛЮК**

# Гмінная статыстыка

Больш за дзесяць гадоў вяду дамашнюю хроніку, у якой памячаю стан надвор’я ды запісваю важнейшыя падзеі з жыцця сваёй сям’і, вёскі і наваколля. Такім чынам распараджаюся неабходнымі данымі, якія неаднойчы выкарыстоўваю ў сваіх допісах. Час ад часу наведваю я гміну ды цікаўлюся статыстыкай. А якія там навінкі?

У Чаромхаўскай гміне пры канцы 2006 года (стан на 31 снежня) пражывала 3 821 чалавек у дванаццаці салэцтвах. У гэтым жа годзе ЗАГС зарэгістраваў 29 нараджэнняў, 36 шлюбаў ды 55 сконаў. Абазначае гэта, што ў чаромхаўскіх вёсках больш людзей памірае, чым нараджаецца. Такая сітуацыя ўтрымоўваецца ад некалькіх гадоў. І так для прыкладу: у 2005 годзе зарэгістравана 30 нараджэнняў, 31 шлюб і 58 сконаў, у 2004 годзе — адпаведна — 32, 28, 53, а ў 2003 годзе — 21, 28, 50. Статыстыка паказвае, што нашы вёскі старэюцца і неўзабаве ў Чаромсе па прычыне браку дзетак прыйдзецца закрыць садок, а мо і школу. Вось вам вынік сучаснай цывілізацыі. Мабыць, неўзабаве людзей ва ўсім заменяць робаты?

**(ус)**

# Медалі парам

Прэзідэнт Рэчы Паспалітай штогод прысвойвае сужонствам медалі з нагоды 50-годдзя шлюбу. Заявы на вылучэнне юбіляраў прад’яўляюць мясцовыя самаўрады. Такое службовае пісьмо з Чаромхаўскай гміны было выслана ў канцылярыю прэзідэнта ў ліпені мінулага года. Сёлета ўрачыстасць уручэння юбілярам узнагарод адбылася 16 лютага ў зале шлюбаў Гміннай управы. Узнагароды ўдастоіліся Вера і Анатоль Бахарэвічы, Ніна і Сяргей Беразовічы, Анастасія і Мікалай Чуракі, Аляксандра і Казімір Канаброцкія з Чаромхі-Станцыі, Лідзія і Анатоль Каплуны з Зубачоў, Марыя і Пятро Русіны з Баброўкі ды Надзея і Мікалай Шыдлоўскія з Апакі.

Ад імя прэзідэнта медалі з віншавальнай граматай уручыў войт гміны Міхал Врублеўскі ў прысутнасці старшыні мясцовай структуры Саюза польскіх пенсіянераў Юзэфа Дубковіча і працаўнікоў ЗАГСа. Па прычыне смерці Сяргея Беразовіча (у мінулым годзе) медаль атрымала жонка Ніна. Мерапрыемства праходзіла пры пачастунку і ў сардэчнай атмасферы. Апрача медалёў юбіляры атрымалі падарункі з пажаданнямі моцнага здароўя, поспехаў у сямейным жыцці ды пачулі „Многае лета”.

**Уладзімір СІДАРУК**

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*
*Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.*

**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Тэхнічны рэдактар:** Адам Паўлоўскі.
**Рэдактар „Зоркі”:** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.

**Камп’ютэрны набор і карэктура:** Яўгенія Палоцкая.
**Друкарня**: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
**Prenumerata:** 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2007 r. upływa 5 czerwca 2007 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2007 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji.

Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł, a kwartalnie — 46,15 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwart. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Południ. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
**Nakład**: 1 835 egz.

Суседскія былі

# ЧАРАДЗЕЙНЫЯ КРОПЕЛЬКІ



Той, хто зазначыў, што лыжка дзёгцю псуе бочку мёду, быў вельмі ўважлівым і кемлівым чалавекам. Толькі дарэмна спыніўся ён на сваіх назіраннях, а то абдарыў бы чалавецтва яшчэ некалькімі трапнымі выразамі, якія ў некалькіх звычайных словах раскрываюць сэнс з'явы і надаюць ёй візуальна вобразную афарбоўку. Бо бывае і наадварот, калі некалькі кропляў нейкай рэчы толькі дадаюць смаку і непаўторнасці вялікаму аб'ёму чагось там, а то і зусім мяняюць структуру рэчаў у тым кірунку, які патрэбны спажыўцу.

Да такой высновы я прыйшоў пасля трэцяй пляшкі пяцідзесяцітрохградуснай вадкасці з непаўторным водарам мастоўскіх лясоў, дзе яна і была зроблена аб'ядннаннем геніяльнасці чалавечага розуму, кемлівасці ды руплівасці яе стваральніка і бяздарнасцю дзеянняў праваахоўных органаў, якія атрымоўваюць заробак якраз і за тое, каб такі вадкі цуд не з'яўляўся на белы свет у самаробным варыянце. А майстэрня гродзенскага мастака Валодзі Касілы, дзе мы сабраліся, каб чарговы раз адзначыць усенароднае любімае свята, прысвечанае двухсотгоддзю гранёнай шклянкі, якраз і была пацвярджэннем велічы чалавечай думкі, якая ў бясконцасці сваёй фантазіі, шляхам эксперыментаў, пробаў і памылак надае гэтаму непаўторнаму напою своеасаблівы смак і дазваляе двухногім істотам, што самі сябе залічылі ў вянец тварэння прыроды, зноў перайсці на поўзанне на чатырох канечнасцях і ў гаворцы наблізіцца да гукаў, якімі карыстаюцца браты нашы меншыя.

— А зараз, — кажа Валодзя, загадкава прыжмурыўшы левае вока, нібыта цэліўся з гарматы па вераб'ях, — я прадэманструю вам сваё новае вынаходніцтва. Працаваў я над ім цэлы год. Глядзіце. Дабаўляю ў літр самагонкі сем кропляў вось з гэтай бутэлькі і вы не адрозніце нашу самаробную гарэлку ні па паху, ні па смаку ад сапраўднага ірландскага віскі дваццаціпяцігадовай вытрымкі, якога і бутэлькі купіць не здужалі б, нават каб скінуліся ўсімі сваімі заробкамі за год.

І сапраўды. Цуд адбыўся. Лепшыя хімічныя лабараторыі свету ганарыліся б такім чарадзеем як Касіла. Усе, хто рэзнуў па кілішку, а гэта былі ўсе, хто быў тады ў майстэрні, не змаглі знайсці аніводнага адрознення ад таго хваленага, вытрыманага гадамі віскі. Праўда, дагэтуль таго віскі ніхто з прысутных, уключаючы і чарадзея, ніколі не каштаваў, але гэта не перашкодзіла прызнаць ідэнтычнасць смаку ірландскага напою і мастоўскай балотнай вадзяры.

— А цяпер навінка сезона! — пад гукі апладысментаў ды ў праменнях славы і хвальбы, якая сыпалася з усіх бакоў, заявіў Валодзя. — Калі я па пяць кропель дабаўлю вось з гэтай колбы, то прападзе пах алкаголю. Можна хоць за руль сядаць. Ні адзін міліцыянт не ўнюхае, што вы ўжо трэці дзень пахмяляецеся з ранку да вечара.

І гэты эксперымент удаўся. Хлопцы перакулілі кілішкі і сталі нюхаць адзін аднаго як пародзістыя сабакі, якіх навучылі шукаць наркотыкі. Але паху алкаголю ніхто не пачуў. Ні з горлышка бутэлькі, ні з горла суседа па стале.

— Ды ты можаш стаць самым багатым мільярдэрам, — у захапленні зрабіў выснову нехта з нюхальшчыкаў. — Запатэнтуй ты гэта. Кожны купіць.

— Ні ў якім разе, — гаворыць Валодзя, паспрабаваўшы надаць свайму твару вобраз творцы, што адчувае персанальную адказнасць за сваё вынаходніцтва перад чалавецтвам. — Будуць ездзіць тады ўсе п'яныя. Яшчэ сп'яна возьмуць і мяне пакалечаць.

З гэтым аргументам прысутныя пагадзіліся. Тым больш, што не было часу на пустыя спрэчкі і размовы. Трэба было працаваць не пакладаючы правай рукі, бо Валодзя працягваў валачы ўсё новыя бутлі і з усё новымі кропелькамі. І ўсё трэба было, як сапраўдным вынаходнікам, праверыць на сабе. А кроплі былі розныя. І ад лішняй вагі, і для павышэння імуннай сістэмы, і ад радыяцыі, і для патэнцыі, і нават ад алкагольнай залежнасці. Праўда, гэтыя рэкамендоўвалася ўжываць з найвялікшай асцярожнасцю, бо яны, тыя кроплі, нібыта, дарэчы як і ўсе іншыя, мелі імгненнае дзеянне. І можна было пры злоўжыванні нормай імгненна стаць няздольным да далейшай дэгустацыі.

— Маю яшчэ такія, што дапамагаюць ад галаўнога болю, — сцвярджае Касіла і капае ў чарговы трохлітровы слоік мастоўскага цуду роўна сем з паловай кропель. — Толькі асцярожна з імі. Ні на паўкроплі больш за норму, бо назаўтра не толькі галава не будзе балець з перапою, — тлумачыць, — але ўвогуле можа быць уражанне, што яе няма зусім.

Усе паслухаліся, кроплямі стараліся не злоўжываць. А вось тым, куды іх капалі, злоўжываць дазвалялася.

— Але мы налізаліся, — схамянуўся нехта з дэгустатараў. — Што жонкі скажуць? Зноў скандалаў наробяць. Бабы ніяк не могуць уцяміць, што мы тут не п'ём, а займаемся выключна выпрабаваннем новых Валодзевых цудадзейных формулаў. Сабой ахвяруем дзеля навукі. Але што ты дурным давядзеш. Зноў пілаваць нас будуць як сухія дровы.

— Не будуць на гэты раз, — упэўнена заявіў Касіла і дастае пяцілітровы буталь са светла-шэрай вадкасцю. — Гэта мая новая распрацоўка. Дабаўляем на слоік гарэлкі ўсяго тры кроплі і аніводная жонка не здагадаецца што мы пілі. Назаўтра спытаеце ў іх ці заўважылі яны, што вы п'яныя. Гарантую — ні адна вас п'яным сёння не ўбачыць. Заўтра праверыце. А я ў сваім зеллі ўпэўнены. Спраўце.

З гэтымі словамі ён накапаў тры кроплі, разліў гарэлку па шклянках і хлопцы іх залілі ў сябе. Пасля паўтарылі гэтыя дзеянні яшчэ некалькі разоў. Першым рухнуў на зямлю самы вялікі маг і чарадзей. Хораша так, як скошаны кулямётнай чаргой. Без слоў. Толькі бутэлька з кроплямі забарабаніла і пакацілася па падлозе. Праз нейкі час і іншыя прымасціліся побач. Хто на стале, хто пад сталом, хто прылёг на падлогу, а хто заснуў там, дзе праводзіў эксперыменты з кроплямі. А назаўтра ўсе пагадзіліся, што апошнія кроплі, каб жонкі не даведаліся, што яны пілі, сапраўды спрацавалі. Жонкі сваіх мужоў у той вечар п'янымі так і не ўбачылі.

**Віктар САЗОНАЎ**

# 06.05 – 12.05

**Баран (22.03. — 20.04.)** Усе твае дзеянні будуць паспяховыя; праніклівасць, цвярозы розум; выкрунешся з пастак, асабліва фінансавых. Трымай вочы вакол галавы — без праблем можаш павялічыць маёмасць.

**Бык (21.04. — 21.05.)** Уражлівасць, рамантычнасць, чуллівасць, далікатнасць. 6-9.05. страшэнная зайздрасць, ахвота загарнуць усё — гэта можа абярнуцца супраць цябе! Можаш аднавіць старое знаёмства.

**Блізняты (22.05. — 22.06.)** Да 8.05. праблемы ў кантактах з атачэннем, перанясі таксама важныя тэрміны. Можаш дасягнуць прафесійных мэт. Апярэдзіш іншых і найхутчэй дабяжыш да мэты. Патаўсцее кашалёк.

**Рак (23.06. — 23.07.)** Краса, любоў атачэння, дыпламатычны талент — паможа гэта табе ў кар'еры. Можаш таксама злавіць кагосьці ў сваё сіло! Калі хочаш адчуць сябе багацейшым, адмоўся ад непатрэбных выдаткаў.

**Леў (24.07. — 23.08.)** Схільнасць да эксперыментаў, прага свабоды і самастойнасці. Сваёй незалежнасцю і геніяльнымі ідэямі спадабаешся ўплывовым людзям. З 11.05. могуць быць расчараванні, няшчырасць іншых. 7-11.05. вострыя канфлікты з аўтарытэтамі (не кідайся з матыкай на Сонца).

**Дзева (24.08. — 23.09.)** Перакanaеш любога ў сваёй рацыі. Дагаворышся з каханай асобай. Да 9.05. ахвота пазбегчы адказнасці, уцячы ад праблем на працы (могуць быць праблемы з-за нядбайнасці).

**Шалі (24.09. — 23.10.)** Набярэшся сілы, адпачнеш. Да 9.05. праблемы з людзьмі, бо будзеш нахабны, патрабавальны (таксама і да сябе), калі патрэбна дыпламатычнасць. Ды змагайся за сваё!

**Скарпіён (24.10. — 22.11.)** Канец з самотай! Можаш закахацца і то ў найменш спадзяваны момант! Кіруйся здаровым розумам. Да 9.05. пабуджаныя аграмадныя эмоцыі (не інвестуй пачуццяў у нявартую таго асобу!). З 11.05. будзь вельмі асцярожны, бо можаш апынуцца ў небяспечнай сітуацыі, калі штосьці будзеш рабіць насілу.

**Стралец (23.11. — 22.12.)** Трываласць, самаўпэўненасць. Зрэалізуеш свае мары, дасягнеш мэт. Добры час на доўгатэрміновыя мерапрыемствы (такі час здараецца раз на пару гадоў!). Ды не ўпірайся пры тым, чаму наканавана параза, захавай раўнавагу.

**Казярог (23.12. — 20.01.)** Да 10.05. час новых магчымасцей. Здзейсняцца твае мары, будзеш спраўны і прадпрымальны. Тое, чым зоймешся цяпер, прынясе багаты плён. Ды з-за Сатурна 7-11.05. рызыка паразы, можа не хапіць сілы, таксама на любоўным палетку; атачэнне не спрые, канкурэнцыя гуляе не па правілах!

**Вадалей (21.01. — 19.02.)** Выразны рост сіл, пераможаш усе перашкоды. Фінансава таксама файна. Ды 9-12.05. будзе цябе цягнуць да перамен, якія акажуцца быць некарыснымі (будзь асцярожны і не спускай з вачэй найважнейшага!).

**Рыбы (20.02. — 21.03.)** Можаш даверыць людзям нявартым гэтага. Можа пакінуць цябе форма, з-за няўвагі можаш падвяргнуцца клопатам і небяспецы. Хочаш павышэння? Дамагайся сам!

**Агата АРЛЯНСКАЯ**

# Адгаданка

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | 32 | 33 | 34 | 35 | 36 | 37 | 38 |
| 39 | 40 | 41 | 42 | 43 | 44 | 45 | 46 | 47 | 48 | 49 | | |
| 50 | 51 | 52 | 53 | 54 | 55 | 56 | 57 | 58 | 59 | 60 | | |

**Шыфраграма**

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — пагаворку.

1. муж Фаціма, першы імам шыітаў = 13 _ 24 _ 12 _;
2. горад у Італіі з мошчамі святога Мікалая Мірлікійскага = 20 _ 15 _ 42 _ 25 _;
3. узбярэжны пясчаны нанос, які перамяшчаецца ветрам = 10 _ 11 _ 51 _ 27 _ 28 _;
4. не перад = 53 _ 57 _ 52 _;
5. муж дачкі = 55 _ 19 _ 18 _ 17 _;
6. тонкі слой ледзяных крышталяў, які ўтвараецца на халодней паверхні = 9 _ 48 _ 49 _ 36 _;
7. мяккая частка пладоў = 46 _ 47 _ 7 _ 8 _ 5 _ 6 _;
8. не верх = 56 _ 54 _ 26 _;
9. пляцоўка пад дахам на слупах для засцярогі, напр., ад непагоды = 34 _ 35 _ 22 _ 21 _ 30 _ 31 _;
10. напр. шчупак = 14 _ 2 _ 3 _ 4 _;
11. незвычайнасць, напр. выкліканая боскай сілай = 16 _ 38 _ 37 _;
12. тонкая лёгкая сятчатая тканіна (фр. tulle) = 59 _ 58 _ 50 _ 60 _;
13. вострая інфекцыйная хвароба (асацыяваць з Альбертам Камю) = 43 _ 45 _ 44 _ 32 _;
14. штат між Невадай і Каларада = 29 _ 1 _ 23 _;
15. з'яўленне ў дамоўленае месца = 33 _ 39 _ 40 _ 41 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 13 нумара**

Труба, калёквіум, унучка, камень, бальніца, усход, мухамор, каша.

Рашэнне: **Кума куму не наробіць шуму.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Міхалу Байко** з Беластока і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

ISSN 0546-1960